Удалося многа зрабіць ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

Арлянскія яўрэі (2) ☞ 9

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 07 (2753) Год LIV | Беласток, 15 лютага 2009 г. | Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

Пасол у Беластоку

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Беласток — сталіца першага рэгіёна, які 5 лютага наведаў пасол Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Польшча Віктар Гайсёнак, па адукацыі фізік, былы міністр адукацыі, у апошні час віцэ-міністр замежных спраў. Сустрэўся ён з уладамі горада і рэгіёна, епіскапамі Іакавам і Грыгорыем, больш за гадзіну размаўляў з журналістамі і гасцямі „Нівы", пасля падчас прэс-канферэнцыі адказваў на пытанні беластоцкіх журналістаў ды наведаў Беларускае грамадска-культурнае таварыства. У нашай рэдакцыі візіт пачаў, спаслаўшыся на размову з прэзідэнтам Лехам Качынскім падчас уручэння вярыцельных грамат, ад сцвярджэння:

— З боку пана прэзідэнта Леха Качынскага адчуў я вялікае зацікаўленне нашай краінай і развіццём нашых стасункаў.

Адзначыў:

— Толькі шляхам двухбаковых размоў можам давесці да нармальных кантактаў.

Адной з галоўных тэм, якія краналіся ў час сустрэч, былі праблемы з атрыманнем віз, асабліва была гаворка пра ільготы пры іх атрымліванні і шматразовыя візы. У час прэс-канферэнцыі ў Культурным цэнтры Беларусі пасол не скрываў:

— Ёсць пэўныя пытанні, якія перашкаджаюць нашаму супрацоўніцтву, перш за ўсё візавыя.

У „Ніве", на просьбу галоўнага рэдактара „Нівы" Яўгена Вапы пра візавыя палёгкі (бясплатныя візы?) для ўдзельнікаў найбліжэйшага з'езда Згуртавання беларусаў свету „Бацькаўшчына" ў ліпені г.г. у Мінску, сказаў:

— Беларусь вядзе цяпер актыўны дыялог з Еўрасаюзам. Справа ў тым, каб ліквідаваць гэты новы берлінскі мур. Маем надзею, што візавы рэжым у адносінах да Беларусі будзе такі самы як для Украіны ці Расіі. Калі гаворка аб беларускай меншасці ў Польшчы, заўсёды стараемся даваць ільготы. Магу абяцаць, што візавыя заявы ўдзельнікаў з'езда „Бацькаўшчыны" будуць разгледжаны асобным парадкам.

Генеральны консул РБ у Беластоку Міхал Аляксейчык дадаў тут, што генеральна праблема не звязана з атрыманнем саміх віз, але з валакітай у разглядзе заяў на акрэдытацыю беларускім МЗС, асабліва кранае гэта журналістаў.

— А мне здаецца, што рэгістрацыя ў нашым МЗС і атрыманне акрэдытацыі не такое складанае, — уключыўся пасол Гайсёнак.

— Складанае, складанае! — з турботай паўтарыў генконсул.

— А ў чым гэтая складанасць? — дапытваўся пасол. — Высветлім крок за крокам.

Фота „Нівы"

Пасол Віктар Гайсёнак у час візіту ў нашай рэдакцыі атрымаў ніўскі каляндар

Журналіст беларускай рэдакцыі Радыё Беласток Юры Ляшчынскі расказаў:

— Я падаваў заяву на акрэдытацыю разоў дваццаць-трыццаць. Так было пры нагодзе папярэдняга з'езду „Бацькаўшчыны". Я трапіў на з'езд, усё яшчэ чакаючы акрэдытацыі. Калі ўжо з'езд кончыўся, паінфармавалі мяне: можаце прыйсці па акрэдытацыю.

Пры нагодзе Юры Ляшчынскі паінфармаваў пасла аб цяжкасцях мясцовых самаўрадавых дзеячаў з запрашэннем інструктараў з Беларусі для беларускіх фальклорных калектываў на Беласточчыне. З-за цяжкасцей, м.інш. візавых, лягчэй такіх знайсці на Украіне.

Спасылаючыся на адмову беларускага боку на прыняцце новых польскіх консулаў у Гродне і Брэсце, пасол сказаў:

— Фактычна не далі мы згоды на прыняцце на працу новых польскіх консулаў. У сапраўднасці мелі б яны працаваць пры выдачы „Карты паляка", парушаючы гэтым самым міжнародныя законы. Цяперашняе выдаванне польскімі консульскімі службамі ў Мінску „Карты паляка" спрэчнае з Жэнеўскай канвенцыяй і двухбаковымі консульскімі пагадненнямі. Такім чынам, згодна з гэтымі дамовамі, консульствы павінны памагаць сваім грамадзянам і выдаваць візы. І столькі ўсяго. Польшча парушае міжнародны закон.

Яўген Вапа заклікаў м.інш. як найскарэй падпісаць польска-беларускую дамову аб малым памежным руху і выказаў шкадаванне, што ахопіць яна паласу толькі ў 30 кіламетраў, а не 50 км, як у свой час прапанавалася (на такі варыянт не пагаджаецца ЕС).

— Праца над пагадненнямі наконт дамовы завяршаецца. Не маю аднак смеласці адназначна сказаць, калі дойдзе да яе падпісання, — заявіў спадар пасол.

Пасля падчас прэс-канферэнцыі ў Культурным цэнтры Беларусі дадаў:

— Падпісанне дамовы рэальна ў аптымістычным плане ў ліпені, песімістычным — пры канцы года.

У „Ніве" ўспамінаў таксама аб сітуацыі Беларусі:

— Наш погляд наступны: Беларусь з'яўляецца незалежнай і самастойнай дзяржавай. Можа дзякуючы таму пачаўся таксама дыялог з ЕС.

У Культурным цэнтры Беларусі на пытанне „Нівы" як успрымае прапанову Польшчы ўключыць Беларусь у еўрасаюзную праграму „Усходняе партнёрства", пасол заявіў, што „яна прынята і з'яўляецца важнай".

— Звяртаем увагу на тое, што Беларусь будзе ўдзельнічаць ва „Усходнім партнёрстве" толькі на роўных прынцыпах з іншымі ўсходнееўрапейскімі дзяржавамі, так як Украіна. Не з'яўляецца добрай абмяркоўваная формула: 27 + 5 + 1 [ЕС + пазаеўрасаюзныя краіны Усходняй Еўропы + Беларусь — М.Х.]. Задавальняе нас формула: 27 + 6.

Яшчэ ў „Ніве" старшыня Беларускага гістарычнага таварыства Алег Латышонак — падобна як і ў час падобнай сустрэчы з папярэднім паслом РБ у Польшчы Паўлам Латушкам (цяпер ён у працяглым водпуску) — паўтарыў прапанову супольнага з Беларуссю адзначання 600-годдзя Грунвальдскай бітвы. У сваю чаргу Яўген Вапа запрапанаваў, каб пасол Гайсёнак ўключыўся ў падрыхтоўку „Біяграфічнага слоўніка беларусаў Падляшша".

АБ-БА

ЗАПРАШАЕ

ПАГАВОРЫМ ПРА...
(ДЫСКУСІЙНЫ КЛУБ АБ-БЫ)

Месца сустрэч: Пачатковая школа нумар 4 Беласток вул. Чэнстахоўска 6а, а гадз. 18.00

13 ЛЮТАГА 2009 г.:

Пагаворым пра адукацыю

— сустрэча з Тамарай Мацкевіч з Менска, кіраўніком адукацыйнага аддзела „Цэнтра Супольнасць" і намеснікам старшыні ТБШ.

Праект рэалізаваны дзякуючы фінансавай падтрымцы Маршалкоўскай управы Падляшскага ваяводства

Аб'яднанне бацькоў
STOWARZYSZENIE NA RZECZ DZIECI I MŁODZIEŻY UCZĄCYCH SIĘ JĘZYKA BIAŁORUSKIEGO „AB-BA" 15-459 Białystok ul. Częstochowska 6a, lok. 8

Сардэчна запрашаем настаўнікаў беларускай мовы на сустрэчу, звязаную з прэзентацыяй „Беларускіх настольных гульняў" („Gier planszowych w języku białoruskim"), якая адбудзецца **14.02.2009 г.** а 10.00 гадзіне ў Пачатковай школе нумар 4 ім. Сібіракоў у Беластоку па вул. Чэнстахоўскай, 6а.

Праграма сустрэчы:

10.00 — прывітанне ўдзельнікаў і інфармацыя пра новыя праекты Аб'яднання АБ-БА,

10.15 — прэзентацыя „Беларускіх настольных гульняў",

10.30 — метадычныя заняткі з кіраўніком адукацыйнага аддзела „Цэнтра Супольнасць" і намеснікам старшыні ТБШ Тамарай Мацкевіч,

11.30 — перапынак, пачастунак,

12.00 — заняткі і паказ метадычнай літаратуры,

14.00 — заканчэнне.

Усе ўдзельнікі сустрэчы атрымаюць бясплатна „Беларускія настольныя гульні".

Голас за „Далі"

Беларускі гурт „Далі" выступіць у канцэрце „Песня для Еўропы — Еўрабачанне-2009", на якім выканае песню „Everyday". Пачатак канцэрта на першым канале Польскага тэлебачання — 14 лютага 2009 г. (субота), гадз. 20:15.

У час канцэрта журы і тэлегледачы пры дапамозе эсэсэмсак выберуць музычны гурт, які будзе прадстаўляць Польскае тэлебачанне на сёлетнім 54-м Конкурсе песні „Еўрабачанне-2009", які адбудзецца 12 і 14 мая (паўфінал) ды 16 мая (фінал) у Маскве.

9 770546 196000

Фальшывая адліга

Апошнім часам частка беларускага грамадства зажыла чарговай ілюзіяй — уражаннем пэўнай палітычнай адлігі, змякчэння рэжыму да сваіх апанентаў і адкрывання вокнаў. Як жа, столькі знешніх прыкмет — датэрміновае вызваленне палітычных вязняў, актыўныя перамовы з Еўропай, рэгістрацыя некаторых аб'яднанняў і рухаў, стварэнне рознага кшталту грамадскіх саветаў (дакладна „саветаў" — мыльных бурбалак, а не сапраўдных радаў), нават „Нашу ніву" і „Народную волю" сталі адкрыта прадаваць у дзяржаўных кіёсках „Белсаюздруку". Пачнём з апошняга. Рэдакцыям гэтых выданняў я параіў бы не кідацца ў эйфарыю. Папершае, тое, што іх дазволілі легальна распаўсюджваць — заслуга ўсёй дэмакратычнай супольнасці. Па-другое, пры ўсёй павазе да творчых калектываў названых газет — агульнай пагоды яны не рабілі і наўрад ці зробяць (асабліва гэта датычыць „Найшай нівы", якая, да слова, магла б парупіцца і пра больш даступны кошт для шырокага чытача). Дзяржаўныя ідэолагі тут пралічылі ўсё беспамылкова. Таму яны нізашто не пусцяць у вольны продаж і распаўсюд, прыкладам, „Газету Слонімскую". Чаму? Таму што яна стварыла рэальную альтэрнатыву раённай пустапарожняй агітцы, выцесніла ў свой час яе з рынку і мела істотны рэгіянальны ўплыў і патэнцыял. А аднаўленне рэгістрацыі забароненых выданняў ці рэгістрацыя новых медый у Беларусі — з'ява з галіны фантастыкі. Яшчэ адзін прыклад. Незалежную і папулярную газету „Прессбол", якая смела раскрыла факты сур'ёзнай карупцыі ў вышэйшых эшалонах кіраўніцтва беларускім спортам, беспадстаўна і цынічна пазбавілі акрэдытацыі на другую алімпіяду запар, пагражаюць шматлікімі судовымі працэсамі за абразу „чэсці" махляроў і прапагандысцкіх халуёў. Ну, а тут яшчэ новую рэдакцыю закону аб друку ўвялі ў дзеянне — наступствы адчуюцца хутка.

На моладзевых лідараў дзяржава абвясціла сапраўднае паляванне. Усіх, каго незаконна зараз забралі ў войска, у абавязковым парадку трэба прызнаць вязнямі сумлення, бо такая рэкрутацыя — не што іншае як выразная форма палітычнага пераследу апанентаў улады.

Рэгістраваць некалі закрыты праваабарончы цэнтр „Наша вясна" ніхто не збіраецца, таму што ён будзе актыўна пільнаваць парушэнні правоў чалавека, што назіраюцца на кожным кроку. Гэтак жа як і партыю Беларуская хрысціянская дэмакратыя, адна назва якой выклікае ў духоўных дзяцей дзяржынскіх-сталіных лютую нянавісць.

Ну, а дзікі выпадак, які адбыўся 8 лютага ў Ваўкавыску, увогуле сведчыць пра ўзмацненне рэпрэсій. Я не ведаю, што антыпраўнага маглі зрабіць былы прадпрымальнік Мікалай Аўтуховіч і яго калегі, якіх зноў арыштавалі. Не думаю, што нешта сур'ёзнае. Але ўрывацца як сапраўдныя бандыты з самага ранку ў кватэру былога дэпутата Вярхоўнага Савета Міколы Аксаміта з сабакамі і дубінкамі і палохаць жонку? Прытым добра было вядома, што гаспадар знаходзіцца ў Польшчы. У выніку шматгадзіннага ператрусу ў кватэры канфіскавалі некалькі старых газет, пасведчанне былога дэпутата і два бел-чырвона-белыя сцягі (во, дзе „крымінал"!). Мірны і спакойны Ваўкавыск ад некалькіх дзесяткаў налётчыкаў у масках быў у шоку. Кажуць, што „спецаперацыю" праводзіла опергрупа падраздзялення самога „Алмаза". Фармальная падстава такіх неапраўдана брутальных дзеянняў — „расследаванне" ні то леташняга выбуху ў Мінску, ні то даўняга ў Ваўкавыску. Фактычная — невядомая. Хутчэй усяго паказаць, хто ў нашай краіне „хозяин". У многіх апрычнікаў рэжыму даўно чэшуцца рукі. Так і чакаюць каманды „фас!", а яшчэ лепей „пли!".

А можа хто-небудзь з грамадскіх актывістаў у апошні перыяд атрымаў магчымасць працаўладкавацца? Таленавіты паэт, былы журналіст і дэпутат райсавета Анатоль Валюк са Свіслачы? Ці творца і інтэлектуал Юры Качук з Зэльвы? Ці той жа мастак і палітык Мікола Аксаміт (які ў свой час у якасці дэпутата парламента ледзь не ў адзіночку спыніў у Мінску грамадзянскую бойню)? Ці нехта з іншых дзесяткаў грамадскіх актывістаў з розных гарадоў і мястэчак, якіх пазбавілі магчымасці зарабляць на жыццё?

Так што аніякага паслаблення і дэмакратызацыі насамрэч няма. Не цешце сябе ілюзіямі спадары ідэалісты. У сур'ёзную палітычную адлігу ў сённяшняй Беларусі могуць паверыць хіба інстытуткі-першагодкі ці еўрасаюзныя камісаршы (якія альбо нічога не разумеюць у нашых рэаліях, альбо элементарна крывадушнічаюць). Як пісаў паэт: „Ці тае снег, ці тае лёд, а ўсё няма адлігі"...

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Стаханаўцы мы

Маладосць — гэта бадай найбольш усхваляемы перыяд жыцця, бо ж гэта час не толькі любоўных парываў, але і час найбольшых сіл, найбольшых магчымасцей. Хто ж з нас не хоча быць маладым, поўным сіл творчым чалавекам, гатовым штурмаваць усялякія бастыёны...

Вось бываю на нашых вёсках і бачу помнікі тутэйшай старой маладосці: клуні, хаты, хлявы, свірны. Не толькі прыватныя, але і больш грамадскага характару, напрыклад, помнікі летуценных мараў пра шчаслівую калектыўную будучыню, значыць былыя калгасныя комплексы, часта развалiны, якіх надта ж шмат па тутэйшых вёсках. Адзін з іх гібее і на задворках Трывежы — у ім мела ж здзяйсняцца тадышняя светлая будучыня.

Цяпер у Трывежы іншы рух, іншы час, іншыя летуценнікі. Вось ужо каторы раз чытаю чорным па белым як гэта там расце наша чарговая светлая будучыня, як там узводзіцца керамічны комплекс. І то не абыкім, але фірмай аж з заходняга замежжа.

Перад прэзідэнцкімі выбарамі 1990 года адна высокаадукаваная мая знаёмая рассакрэціла мне, што яна прагаласуе за Тымінскага, бо ён на Захадзе мае нейкія грошы, то можа ад іх і нам што капне. Ды і наш просты фальклор славіць песнямі казака ад далёкага Дунаю. А што ўжо гаварыць, калі той казак ад блакітнейшага Дунаю, з Аўстрыі, з Захаду, ад якога яшчэ можа што і капнуць.

Адхіліўся я ад нашых блакітнахвальных старонак, дзе чорным па белым, і заглянуў на старонкі віртуальныя, на сайт фірмы „Leier", якая, паводле тутэйшага меркавання, збіраецца збудаваць нам чарговую светлую будучыню. Сайт гэты не нясе бухгалтарскіх падлікаў ці аналізаў — гэта звычайны рэкламны буклет з каляровымі здымкамі ды такімі ж партрэтамі хвацкіх чыноў — усе яны ў белых кашулях, усе яны пад гальштукамі, усе яны пад усмешкай; усміхнуўся і я.

Фірма прысутная ў Польшчы ўжо дваццаць гадоў, мае заводы ў Мальбарку і Тарнаве, апрача іх склады ў Альштынку, Свеці, Стшэльцах-Апольскіх, Вялічцы, Закрочыме. Апрача Польшчы і Аўстрыі фірма прысутная ў Венгрыі, Славакіі, Румыніі і Харватыі. Займаецца яна вытворчасцю і пастаўкай на шырокі рынак розных будматэрыялаў: каміноў, бетонных і цагляных пустакоў, сталебетонных сценак, скляпенняў, дахаў, чарапіцы, лесвіц, тратуарных плітак і бруской, бетонавых сумесей. Апрача будаўніцтва фірма займаецца гандлем аўтамабілямі, расфасоўкай зямлі пад кветкі, мае некалькі дзесяткаў шыкарных нерухомасцей.

Не ўдалося мне з гэтага матэрыялу даведацца ці фірма ўзводзіла свае заводы ад фундаментаў, як гэта мела б быць у нас. Бо, напрыклад, каля Тарнава купіла яна аб'екты тамашняй цагельні ад падаючага дзяржаўнага прадпрыемства. У Харватыі таксама купіла гатовы аб'ект, які мадэрнізавала, а на запуску ў ім прадукцыі прысутнічаў сам прэзідэнт Харватыі Сціпе Месіч. Ды і наш Лех Качынскі таксама меў дачыненне з чакаемай у Трывежы фірмай: ён адкрываў у Дзьёры помнік венгерска-польскай дружбы, які быў абмошчаны брускамі „нашай" фірмы.

Фірма „Leier" цалкам нядаўна, восенню мінулага года, запусціла цагельню каля Кашыцаў на ўсходзе Славакіі. Лакалізацыю яе фірма тлумачыць так: „Кашыцы гэта другі па велічыні горад Славакіі і свайго роду вярчальны дыск паміж Польшчай, Украінай і Венгрыяй. Украіна, гэта чарговы рынак, выгадны для паставак фрахту з фірмавых заводаў у Венгрыі, Славакіі і Польшчы". Значыць, фірма бярэ прыцэл на Усход. Магчыма, што і Трывежа з'яўляецца плацдармам для наступлення на ўсходнім напрамку — у Беларусь ці Прыбалтыку...

Магчыма таксама, што разведчыкі фірмы „Leier" пабачылі і ў нас вялікія магчымасці для збыту сваіх прапаноў. Пабачыўшы нашы хілыя вясковыя пабудовы мо яны заключылі, што ў нас няма будматэрыялаў. Пабачыўшы бядотнае ў нас курсіраванне паяздоў і аўтобусаў, мо заключылі, што нам патрэбныя легкавушкі...

У 2007 годзе ўладальнік фірмы гаварыў: „Рынак буйнее як ніколі. У Польшчы людзі купляюць навалам, а будматэрыялы ўсё даражэюць. З медыямі і запалам далёка зойдзем!.."

А ўжо ў наступным, 2008 годзе, напрыклад, буйныя іспанскія будаўнічыя фірмы сталі рэзка згортваць свае бізнесы (мо яны іх разгорнуць у нас?). Буйныя японскія аўтаканцэрны сталі скарачаць вытворчасць, а амерыканскія, адгорнутыя ад вадзіцельскіх кішэняў, падчапіліся пад кішэні сваіх падаткаплацельшчыкаў... А што чакае фірмы, якія пастаўляюць аўтамабілі і будматэрыялы?...

Сайт фірмы „Leier" не згадвае пра Трывежу. Толькі мы тут, на нашых старонках, чорным па белым, з маладняцкім запалам будуем нашу чарговую светлую будучыню. Хіба і далёка зойдзем...

Аляксандр ВЯРБІЦКІ

Вачыма еўрапейца

Рэшітка сухой скарынкі

Толькі цяпер меў я нагоду пазнаёміцца са стэнаграмай з апошняга пасяджэння сеймавай камісіі нацыянальных і этнічных меншасцей (другая палова студзеня), прысвечанага дыскусіі над інфармацыяй міністра ўнутраных спраў і адміністрацыі аб „ходзе прыёму і верыфікацыі датацый на падтрыманне і развіццё культурнай тоеснасці меншасцей". „Ніва" ўжо пісала, што сёлета на ўсе меншасці Сейм у бюджэтным законе прызначыў каля 13 млн. зл., прытым не толькі на мерапрыемствы, але таксама і на інвестыцыі. Як мы пісалі, гэтая сума меншая ад абрэзанай мінулагодняй. У стэнаграме аднак я вычытаў, што ёсць нейкія аптымістычныя сігналы. Вось віцэ-міністр УСіА Тамаш Сямоняк прадбачыў дапамогу ў атрыманні пазабюджэтных — еўрасаюзных — сродкаў:

— У будучым хочам стварыць орган па ўзору назіральных камітэтаў, які зоймецца еўрасаюзнымі сродкамі. Той орган, які выводзіўся б ад Супольнай камісіі ўрада і нацыянальных ды этнічных меншасцей, не абмяркоўваў бы мерытарычных пытанняў наконт сум і заяў. Затое займаўся б самымі рознымі працэдурнымі сумненнямі.

Між іншым гэтае паведамленне не пераканала ўсіх дэпутатаў да таго, што 2009 год у фінансавым плане можа быць адносна неблагім. Літаральна выказаў гэта дэпутат Казімеж Куц (ГП):

— Вось маем мы 13 меншасцей ды шмат меншасных саюзаў у Польшчы. Дзяржава ласкава дае 13 мільёнаў злотых на ўсю гэтую экзатычную натуру ды да таго разам з інвестыцыямі — гэта жалюгоднае. Гэта нейкая рэшітка сухой скарынкі хлеба. У гэтым якраз бачны тыя страшныя традыцыі ў трактаванні ўсяго, што іншае, у ганебны спосаб (...). Цяперашні ўрад і кіруючая партыя — са сваёй праграмай, ідэаламі, ідэалогіяй — павінны саромецца (...). Я ўвесь час адчуваю, што ўсім сунулі ў раты гістарычную заткалу і трымаюць іх у нейкім страху.

Віцэ-міністр адказаў:

— Я хацеў бы сказаць, што наша сціплая роля асноўваецца на тым, каб разумна і рацыянальна расходаваць такую суму, якую Высокая палата назначыла ў бюджэце.

Я мог бы нават пагадзіцца са сцвярджэннямі дэпутата Куца, але фактычна гэта ж парламент канчаткова вырашае аб бюджэце, уключна з запісам аб выдатках на нацыянальныя меншасці. Таму спытаюся ў пана дэпутата, прадстаўніка тае кіруючай партыі, але і ў іншых дэпутатаў з меншаснай камісіі, чаму, пры ацэнцы праекта сёлетняга бюджэту, камісія аднагалосна не заявіла аб ніякіх папраўках.

Пры нагодзе адчытвання стэнаграмы з пасяджэння камісіі я прыгледзеўся м.інш. сумам, якія даў сёлета прэзідэнт Беластока. На больш за сто датацый назначаных ім у галіне культуры, мастацтва і аховы традыцыйных здабыткаў культуры ёсць ледзь за дзесятак звязаных непасрэдна з беларускай меншасцю. Найбольш грошай атрымаў Фонд царкоўнай музыкі на арганізацыю XXVIII Міжнароднага фестывалю царкоўнай музыкі „Гайнаўка" ў Беластоку (80 тыс. зл.). Згуртаванне аматараў царкоўнай музыкі на канкурэнтны Міжнародны фестываль „Гайнаўскія дні царкоўнай музыкі" атрымала 12 тысяч зл. Я разумею, што амаль сімвалічная сума (у параўнанні з датацыяй на Фестываль царкоўнай музыкі) на Гайнаўскія дні вынікае з месцаразмяшчэння абодвух мерапрыемстваў: Беласток — Гайнаўка. Аднак не магу сабе растлумачыць чаму Гміннаму асяродку культуры ў Ясяноўцы на міжнародныя прэзентацыі мажарэтак, тамбур-мажорак і чырлідарак дасталася больш, чым на Гайнаўскія дні. Урэшце ж Ясяноўка таксама не распаложана ў межах Беластока. І я застануся з гэтак пастаўленым пытаннем.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

Удалося многа зрабіць

Самаўрадавая мітусня патрабуе ад людзей, якія ў яе заангажаваліся, многа энергіі і часу. Спачатку трэба стварыць добрую праграму ў карысць мясцовага грамадства, многа набегацца, каб дайсці з ёй да выбаршчыкаў і здабыць добры вынік у час выбараў. Пазней трэба ўмела размаўляць з іншымі выбарчымі камітэтамі, каб стварыць правячую кааліцыю, якая сумее пераадолець цяжкасці і з дапамогай апазіцыі (калі гэта магчыма) працаваць для дабра грамадства. Ці ўдалося гэтае зрабіць у Бельскім павеце? Паспрабаваў я гэтага даведацца, слухаючы выступленні гаспадароў і гасцей у час вялікага мерапрыемства, прымеркаванага ў галоўным да дзесяцігоддзя Бельскага павета, а таксама размаўляючы з беларускімі радными. Зараз беларусы з Беларускага камітэта (прадстаўнікі „Бельскай кааліцыі"), з'яўляюцца хіба адзінымі павятовымі радными на Беласточчыне (калі гаварыць пра Беларускія выбарчыя камітэты), якія ўваходзяць у правячую кааліцыю і маюць рэальнае ўздзеянне на перамены, якія адбываюцца ў іх павеце. У іншых паветах на Падляшшы або няма радных, якія былі б прадстаўнікамі ад Беларускіх камітэтаў або гэты Беларускі выбарчы камітэт не ўваходзіць у правячую кааліцыю. Зараз намеснікам старасты Бельскага павета з'яўляецца беларус Пётр Божка, а іншы беларус, дырэктар Комплексу школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы Васіль Ляшчынскі з'яўляецца намеснікам старшыні Рады Бельскага павета. Беларусы — Пётр Божка і Міраслаў Бало актыўна працуюць ва ўправе Бельскага павета, маючы рэальны ўплыў на вырашэнне беларускіх спраў.

Падвядзенне вынікаў дзесяцігадовай дзейнасці яшчэ даволі маладога, калі гаварыць пра час працы, бельскага павятовага самаўрада адбылося 29 студзеня ў час урачыстага мерапрыемства ў Комплексе школ № 4 у Бельску-Падляшскім, якім апякуюцца павятовыя ўлады. Урачыстасць у асноўным распачалася з выступлення старасты Бельскага павета Славаміра Ежы Снарскага, які прывітаў гасцей, а сярод іх епіскапаў — Драгічынскага Антоні Дыдыча, Сямятыцкага Георгія, каталіцкае і праваслаўнае духавенства, паслоў Сейма Роберта Тышкевіча і Яраслава Матвеюка, ваяводу Мацея Жыўну, генеральнага консула Рэспублікі Беларусь Міхала Аляксейчыка і шматлікіх самаўрадаўцаў. Апошнім часам у Бельскім павеце штогод ладзіліся навагоднія сустрэчы, на якія запрашаліся прадстаўнікі розных устаноў і прадпрыемстваў. У гэтым годзе навагодняе мерапрыемства было спалучанае з юбілейнай сустрэчай, а ў святочны настрой увёў калектыў песні і танца з сельскагаспадарчай школы „Падляшскія зязюлі".

Можна вяртацца да 600-гадовай даўнасці

Стараста Славамір Ежы Снарскі расказаў пра дзейнасць Бельскага павета ў далёкім мінулым і на працягу апошніх дзесяці гадоў. Аказваецца, што пісьмовыя звесткі пра Бельскі павет можна ўжо знайсці ў XIV стагоддзі і таму можна гаварыць нават пра больш чым 600-гадовую даўнасць Бельскага павета. Сабраныя даведаліся, што бельскім старастам быў, між іншым, Ян Клеменс Браніцкі, а Ізабела Браніцкая — фундатарам многіх сакральных аб'ектаў на тэрыторыі павета.

— У 1843 годзе да Бельскага павета належалі, між іншым, Бельск, Браньск, Драгічын, Нарва і жыло ў ім 106 тысяч людзей. Ажно 191 тысяч жыхароў было ў Бельскім павеце пасля апошняй вайны, але ў пяцідзесятых гадах выдзеліліся з яго Гайнаўскі, а пасля Сямятыцкі паветы. Зараз у нашым павеце жыве каля 60 тысяч людзей і ёсць два гарады, Бельск і Браньск, — сказаў пра гісторыю стараста Славамір Ежы Снарскі, а пасля перайшоў да сучаснасці. — У першым скліканні было перабудаваных каля 35 кіламетраў дарог, праводзілася мадэрнізацыя многіх сістэмаў ацяплення і пачаўся рамонт шпіталя.

Цяжкімі былі першыя гады

Радныя з „Бельскай кааліцыі", якія ў час першых выбараў набралі пад 40% галасоў, апынуліся ў апазіцыі.

— У першых гадах працы павятовай рады першага склікання (1998-2002) панавала атмасфера непрыхільнасці з боку радных кааліцыі „Еднасць" да нашых радных з „Бельскай кааліцыі". Рада прымала пастановы, якія прапанавалі радныя з „Еднасці" і не было магчымасці перапіхнуць нашыя прапановы. Быў перыяд, што я і Юрый Іванчук не былі дапушчаны да працы ў камісіях, што было парушэннем законаў. Кожны радны не толькі мае права працаваць у камісіях, але гэта проста яго абавязак. Праз тры гады працы нашай рады нельга было пераканаць радных з кааліцыі „Еднасць", каб прызначылі сродкі на беларускія мерапрыемствы ці іншыя ініцыятывы, якія садзейнічалі б у карысць беларускага грамадства (дзейнічаў белліцэй, на які ішлі датацыі з цэнтральнага бюджэту — А. М.), — расказвае Васіль Ляшчынскі — павятовы радны на працягу дзесяці гадоў.

— Вельмі цяжка было нам першапачаткова працаваць у Радзе Бельскага павета, дзе радныя з кааліцыі „Еднасць" вельмі адмоўна ставіліся да нас, беларусаў. Мы з Васілём Ляшчынскім стараліся выступаць з прапановамі ад імя беларусаў, але да нас ставіліся з прэтэнзіямі. Закідалі нам, напрыклад, што дарогі ў Арлянскай гміне будаваліся на працягу 50 гадоў панавання народнай улады і спачатку не адводзілі грошай на рамонты дарог у гэтай гміне. Толькі пад канец першага склікання атмасфера ў радзе стала нармалізавацца, — расказвае дырэктар Бельскага дома культуры Сяргей Лукашук, радны першага (1998-2002) і другога (2002-2006) скліканняў. — Калі гаварыць пра дарожныя інвестыцыі па-за Бельскам, яны ў першым скліканні ў галоўным рэалізаваліся ў гмінах Браньск, Рудка і Вышкі.

Са зменай улады памянялася атмасфера працы

— Адліга прыйшла яшчэ ў канцы першага склікання, калі сярод радных кааліцыі „Еднасць" пачало дзейнічаць некалькі лідараў, якія не маглі дагаварыцца паміж сабой. Тады частка радных з „Еднасці" ўключылася ў дзейнасць „Нашага Падляшша" і радныя, што падтрымлівалі ўправу, сталі прасіць нас, каб мы памаглі ім у час галасаванняў. Не хапала ім сваіх галасоў, каб на пасяджэннях рады прымаць прапановы ўправы павета, — дабаўляе радны Васіль Ляшчынскі. — Калі шэсць гадоў таму „Бельская кааліцыя" пачала супрацоўнічаць з „Нашым Падляшшам", адносіны да беларускіх радных памяняліся і палепшала атмасфера працы ў радзе. Зараз у нас таксама добра складваецца супрацоўніцтва з нашым кааліцыянтам.

Шэсць гадоў таму радным з „Бельскай кааліцыі" ўдалося дагаварыцца з раднымі з камітэта „Нашае Падляшша" і супольна стварыць правячую кааліцыю. Тады намеснікам старасты стаў Пётр Божка, а намеснікам старшыні Рады Бельскага павета — Васіль Ляшчынскі, які з'яўляецца ім па сённяшні дзень. Выбары, якія адбыліся два гады таму, у асноўным не памянялі супрацоўніцтва паміж кааліцыянтамі. Адбыліся толькі невялікія персанальныя змены, як у радзе, так і ва ўправе павета. Кааліцыя, якую саставляюць „Нашае Падляшша" і ў асноўным Беларускі камітэт з „Бельскай кааліцыі", удала прадаўжаюць дзейнічаць у карысць мясцовага грамадства.

— Калі ў другім скліканні (2002-2006) адбылася змена ўлады, былі яшчэ зроблены праекты рамонтаў дарог, у галоўным распаложаных у гмінах Браньск, Рудка і Вышкі і трэба было рэалізаваць запланаваныя загадзя інвестыцыі. Пазней інвестыцыі разлажыліся раўнамерна на ўвесь павет і апошнім часам рамантаваліся дарогі ў Арлянскай і Бельскай гмінах, — удакладняе былы радны Сяргей Лукашук.

— У Бельскім павеце на працягу дзесяці гадоў з дапамогай вонкавых і гмінных сродкаў удалося адрамантаваць каля ста кіламетраў дарог (67 кіламетраў у другім і трэцім скліканнях — А. М.). У другім скліканні нам удалося раздабыць многа еўрасаюзных сродкаў. На працягу шасці гадоў, калі „Бельская кааліцыя" супрацоўнічае з „Нашым Падляшшам", многа грошай мы выдаткавалі на тэрмаізаляцыю шпітальных будынкаў, на рамонтныя работы ўсярэдзіне бальніцы і на куплю дарагой апаратуры для нашага шпіталя. Рэалізавалі мы таксама многа рамонтных інвестыцый у школах. Зараз канчаем рамантаваць стадыён „Орлік" пры Комплексе школ № 1. Адрамантавалі мы вялікую спартыўную залу пры Комплексе спецыяльных школ, стварылі Сямейны дзіцячы дом у Бельску, а за паляпшэнне якасці працы стараства атрымалі сертыфікат упраўлення якасцю ISO, — пералічвае намеснік старасты Пётр Божка. — Маем атрымаць сродкі з Міністэрства ўнутраных спраў і адміністрацыі на тэрмаізаляцыю будынка Бельскага белліцэя і на змену даху ў ім. Прадбачваем таксама рамантаваць гэтую школу ўсярэдзіне, дакладаючы ўласныя сродкі. Дафінансоўваем мы таксама беларускія мерапрыемствы ў нашым павеце.

У час мерапрыемства гаварылася пра Бельскі белліцэй як пра візітную картачку Бельскага павета. Заняў жа ён дванаццатае месца ў нашай краіне і другое ў Падляшскім ваяводстве ў рэйтынгу сярэдніх школ, ладжаным часопісамі „Жэчпасполіта" і „Перспектывы". На сустрэчы былі ўручаны сувеніры з падзякай за дапамогу і працу ў карысць мясцовага грамадства. Атрымалі іх праваслаўны мітрапаліт Сава (прадстаўляў яго епіскап Сямятыцкі Георгій), каталіцкі епіскап Драгічынскі Антоні Дыдыч, бельскія праваслаўны і каталіцкі дэканы, радныя трох скліканняў і павятовы скарбнік. Стараста выступіў таксама з навагоднімі пажаданнямі і разам са сваім намеснікам Пётрам Божкам узнагародзіў сувенірамі прадстаўнікоў розных устаноў і прадпрыемстваў. Мерапрыемства закончылася прамовамі гасцей, выступленнямі з калядкай і песнямі моладзі са студыі песні „Фарт" з БДК і пачастункам для гасцей.

Сувеніры з падзякай за дапамогу і працу ў карысць мясцовага грамадства атрымалі мітрапаліт Варшаўскі і ўсяе Польшчы Сава (прадстаўляў яго епіскап Сямятыцкі Георгій), епіскап Драгічынскі Антоні Дыдыч, бельскія праваслаўны і каталіцкі дэканы, радныя трох скліканняў і павятовы скарбнік

Нараўчанская гміна

Таполі

2 снежня 2008 года ссеклі старыя таполі ля будынка колішняй школы ў Плянце. Гмінная ўстанова ў Нараўцы прадала іх суполцы ў Міхалове. Таполяў ніхто не забірае. Яны так і ляжаць на тамашнім скрыжаванні дарог да сёння.

Павятовае праўленне дарог у Гайнаўцы ссекла таполі на адным са скрыжаванняў дарог у Новым Ляўкове (мясцовыя гэтае месца называюць „Пацановам" і так ужо яно прынялося). Ссеклі і на гэтым усё скончылася. А чаму не забралі драўніны?

Паінфармаваў я пра гэтыя ссечаныя дрэвы на дарогах начальніка Аддзела камунікацыі і дарог у Павятовым старостве ў Гайнаўцы і войта Нараўчанскай гміны.

Допіс гэты я пісаў у канцы студзеня г.г. Справа ссечаных і пакінутых на абочынах ваяводскіх і павятовых дарог дрэў не зварухнулася з месца. Мёртвыя таполі самі ж не зварухнуцца!

Гайнаўка

Што ў 2009 годзе?

У 2009 годзе ў Гайнаўцы плануюць пабудаваць асфальтавыя масты на вуліцах Стралецкай, Арміі Краёвай, Адлеглай, Летняй, Тарговай і Жабінай Горцы. Па вуліцах Арміі Краёвай, Жабінай Горцы, Адлеглай, Летняй і Тарговай будуць пракладзены тратуары, а паўз вуліцы Арміі Краёвай, Жабінай Горцы і Тарговай — размечаны веласіпедныя сцежкі.

Новыя энергаашчадныя электраўстаноўкі атрымаюць вуліцы Жабіна Горка, Летняя і Тарговая. Дажджавую каналізацыю пракладуць пад вуліцамі Жабінай Горкай, Адлеглай, Летняй і Тарговай.

(яц)

Шанц на пераацэнку

Пенсіянеры, якім ЗУС не налічваў платы пры вызначэнні пенсіі па прычыне затраты дакументаў (за г.зв. „нулявыя стаўкі"), могуць хадайнічаць за пераацэнкай сваіх пенсій. На такую магчымасць дазваляе адноўлены закон аб пенсіях, які ўступіў у сілу 1 студзеня 2009 года (Dz.U. nr 192 poz. 1180 z 2008 r. — nowelizacja ustawy o emeryturach i rentach). Тычыцца гэта асоб, якія нарадзіліся да 1 студзеня 1949 года, як і тых, якія нарадзіліся паміж 1 студзеня 1949 г. і 31 снежня 1968 г., а прад'явілі ў ЗУС заявы аб вызначэнні ранейшай пенсіі. Заявы можна прад'яўляць да канца года, а пераацэнка будзе належаць ад 1 студзеня 2009 г. (незалежна ад тэрміну падачы заявы). Не варта затым спяшацца. Хто пашле заяву ў наступным годзе, прыбаўка будзе абавязваць ад першага дня месяца, у якім ЗУС атрымае дакументы. Раней даныя аб зарплаце заносіліся ў страхавыя кніжкі (książeczki ubezpieczeniowe) і неаднойчы пасведчанні не далучаліся да акт працаўніка. Калі дакументы западзеліся, у такіх выпадках пакрыўджаны быў вымушаны адстойваць свае правы ў судзе на аснове страхавой кніжкі. Але ЗУС гэтага не прызнаваў і запісваў адно нулявую стаўку. Паводле новага закону асоба, якая хадайнічае за пераацэнкай, можа зараз прасіць налічыць плату з дзесяці чарговых гадоў апошняга дваццацігадовага стажу працы, або дваццаці адвольных гадоў усяго працоўнага стажу.

(ус)

Юбілейная алімпяда беларускай мовы

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

У акруговых элімінацыях XV юбілейнага выпуску Алімпіяды беларускай мовы (арганізатар — Кафедра беларускай філалогіі Варшаўскага ўніверсітэта), якія 29 студзеня адбыліся ў Комплексе школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы, прыняло ўдзел больш за пяцьдзесят вучняў. Традыцыйна самую вялікую колькасць удзельнікаў сваёўлялі гайнаўскія белліцэісты. Апрача іх 16 асоб прыехала з Бельскага белліцэя і 9 вучняў з Беластока. У Бельскім белліцэі вучні рашаюцца на ўдзел у алімпіядзе ў пачатку навучальнага года і да студзеня рыхтуюцца пад наглядам настаўнікаў беларускай мовы. У Гайнаўцы падрыхтоўка пачынаецца пазней, але вучні больш масава прыступаюць да спаборніцтваў. Калі б прааналізаваць вынікі пераможцаў беларускіх алімпіяд на працягу апошніх гадоў, то колькасць лаўрэатаў і фіналістаў з Гайнаўскага і Бельскага белліцэяў хіба была б падобнай. У мінулым годзе ўпершыню і вельмі ўдала выступілі ліцэісты з Беластока.

Гайнаўскія белліцэісты, першакласнікі, са сваёй настаўніцай Аннай Каліноўскай (злева Давід Карчэўскі)

Тыя, што не маюць дачынення з сённяшняй школай, могуць задумацца ці алімпіяду можна назваць спаборніцтвам? Аднак апошнім часам многа памянялася ў нашай адукацыі і зараз усю вучобу ў сярэдніх школах можна прыраўняць да спаборніцтваў за заліковыя кніжкі вышэйшых устаноў. Каб добра справіцца з матуральнымі экзаменамі, што дае магчымасць быць прынятым на выбраную спецыяльнасць, добра ўжо з першага класа ліцэя ці тэхнікума ведаць свае зацікаўленні і ў сярэдняй школе інтэнсіўна вучыцца, а праца дома з кніжкай не лягчэйшая за спартыўныя трэніроўкі. Іншы спосаб, каб трапіць на прэстыжную спецыяльнасць у вышэйшай установе, гэта дабіцца асаблівых поспехаў на прадметнай алімпіядзе з профілем набліжаным да будучай спецыяльнасці. Каб здабыць званне лаўрэата алімпіяды таксама трэба многа вучыцца на працягу некалькіх гадоў і, як гавораць вучні, мець крыху шчасця.

Эмілія Місіюк з Курашава пісала працу на трэцюю тэму — „Галоўныя імкненні і мэты ў маім асабістым жыцці".

— Пішучы работу на вольную тэму я магла раскрыцца і напісаць пра тое, што думаю, — сказала яна.

— Я пісала на другую тэму — „Асуджэнне царскай сістэмы ў творчасці Кастуся Каліноўскага", — гаворыць Юстына Пашко з Катлоўкі.

Многія ліцэісты таксама пісалі творчыя работы на тэму Кастуся Каліноўскага і яго „Мужыцкай праўды".

— Каб пісаць працу на вольную тэму, трэба мець вялікі запас слоў і добра валодаць беларускай літаратурнай мовай, — кажа настаўніца беларускай мовы Гайнаўскага белліцэя Анна Каліноўская, якая ў белгімназіі вучыць ужо чацвёрты год.

Вучні першых класаў Гайнаўскага белліцэя, якія ўжо рашыліся прымаць удзел у алімпіядзе, дыпламатычна тлумачылі, што хочуць распазнаць як адбываецца алімпіяда, каб у наступным годзе, з вопытам і новымі ведамі, прыступіць яшчэ раз. Аднак некаторыя з іх разлічваюць, што ўжо і ў гэтым годзе могуць перайсці ў цэнтральны этап і стаць фіналістамі алімпіяды, што гарантуе ім самую вялікую колькасць балаў на матуральным экзамене па беларускай мове. Усе першакласнікі згодна заявілі, што пісалі працы на першую тэму, але ніхто з іх не мог дакладна яе паўтарыць. Адна з дзяўчат пабегла ў залу і яшчэ раз з дошкі прачытала першую тэму.

— „Асноўныя тэматычна-праблемныя тэндэнцыі ў «Мужыцкай праўдзе» Кастуся Каліноўскага", — паўтарыла белліцэістка і дадала, што не ведае, ці пішучы работу добра зразумела сэнс слоў.

— Ці вас зацікавіла постаць Кастуся Каліноўскага? — пытаю вучняў першых класаў.

— Так, ён быў добрым чалавекам, рэвалюцыянерам і хацеў, каб добра жылося мужыкам, — адказвае адна з дзяўчат.

— Ленін таксама быў рэвалюцыянерам і выступаў публічна ў абарону мужыкоў, а самі ведаеце да чаго давяла ўлада рэвалюцыянераў, — працягваю дыскусію.

— Кастусь Каліноўскі выступаў у абарону нацыянальных спраў беларусаў, — кажа Давід Карчэўскі.

Ён і сяброўкі з першых класаў згодна заяўляюць, што так, як і герой іх пісьмовых прац, лічаць сябе беларусамі.

— А што было найбольш вырашальным у вашым выпадку, што вы пачалі лічыць сябе беларусамі, а не палякамі? — дапытваюся.

— Сям'я, — першы адказвае Давід Карчэўскі.

— Нашы абрады, традыцыя і культура, — дабаўляюць іншыя белліцэісткі.

У час вусных адказаў вучні цягнулі білеты з адным пытаннем і падкрэслівалі, што ў час гэтай часткі алімпіяды многа залежыць ад шчасця.

— Рыхтуючыся да вусных адказаў мы асаблівую ўвагу звярталі на жыццё і творчасць пісьменнікаў. У мінулых гадах трэба было расказваць пра свой ліцэй, сям'ю, сваё жыццё і ведаць, што гаварыць на тэмы рэлігійнага характару. У вуснай частцы паяўляецца таксама пытанне: хто мы — палякі ці беларусы? — гаворыць Эмілія Місіюк.

— А кім вы сябе лічыце? — пытаю.

— Вядома, што беларусамі, — адказваюць Эмілія Місіюк і Юстына Пашко.

— А можа толькі прыкідваецеся перада мной, а ў вашым сэрцы што іншае? — дапытваюся.

— Не, мы ад сэрца лічым сябе беларусамі, так як лічылі нашы дзяды і прадзеды, — завяраюць дзяўчаты.

Эмілія і Юстына вучацца ўжо ў трэціх класах і хочуць працягваць вучобу ў вышэйшых установах. Плануюць вучыцца бліжэй дому — у Беластоку. Аднак у нашым ваяводскім горадзе ў час набору ў вышэйшую ўстанову, апрача беларускай філалогіі, зараз малое значэнне прыдаецца лаўрэатам Алімпіяды беларускай мовы.

— Некаторыя мае сяброўкі ідуць вучыцца ў Варшаву. Хочуць яны выкарыстаць прывілеі, якія дае перамога на беларускай алімпіядзе, бо там, будучы лаўрэатам, можна яшчэ стаць студэнтам некаторых спецыяльнасцей без адбору, — разважае Юстына Пашко.

— Апошнім часам і ў Варшаве штораз менш ў вышэйшыя установы прымаюць без экзаменаў лаўрэатаў нашай алімпіяды, а ў чарговым акадэмічным годзе з гэтым можа быць яшчэ горш, — заяўляе настаўніца і метадыст беларускай мовы Іаланта Грыгарук. — На многіх спецыяльнасцях не хочуць улічваць балаў па матуральным экзамене беларускай мовы як балаў па замежнай мове.

Шкада, што перамога ў Алімпіядзе беларускай мовы дае штораз меншыя магчымасці (раней былі вельмі вялікія і белліцэісты карысталіся імі), калі гаварыць пра прывілеі ў час набору ў вышэйшыя ўстановы. Аднак засталіся прывілеі, што тычацца матуральнага экзамену па беларускай мове і напэўна набору на беларускую філалогію як у Варшаве, так і ў Беластоку. Пасля гэтай філалогіі былыя гайнаўскія і бельскія белліцэісты знаходзілі і знаходзяць працу, хаця ў многіх выпадках не супадаючую непасрэдна з атрыманай вышэйшай адукацыяй. Выпускнікі беларускай філалогіі становяцца журналістамі электронных масмедыяў (а ў гэтым ліку і беларускіх), мытнікамі, ці выконваюць іншыя прафесіі.

Каліноўскі — нязручны герой

Мясцовасць Мастаўляны настала ўпісана ў гісторыю беларускага народа. Менавіта ў гэтую, невялікую цяпер вёску пры самай мяжы з Беларуссю, лёг шлях у марозны нядзельны дзень. Нагодаў для адведвання Мастаўлянаў было нават дзве: 1 лютага — 146 гадавіна пачатку паўстання 1863-1864 гадоў у Літве і Беларусі, а 2 лютага 1838 года менавіта ў Мастаўлянах прыйшоў на свет яго кіраўнік і адзін з найбольш рамантычных герояў беларускай гісторыі — Кастусь Каліноўскі.

Ініцыятарамі паездкі былі стыпендыяты навучальнай праграмы імя Кастуся Каліноўскага, якія ўжо некалькі гадоў дзейнічаюць у межах ініцыятывы Беларуская Нацыянальная Памяць і займаюцца пошукам і ўшанаваннем памяці беларускіх дзеячаў па-за межамі Беларусі. Да таго ж, да іх далучыўся і беларускі гісторык, прафесар Алег Латышонак, што зрабіла групу моцнай калі не колькасна, дык якасна.

Невялікая грамада разам з далучыўшымся бацькам солтыса вёскі спадаром Уладзімірам Зарэцкім прайшла па Мастаўлянах з нацыянальнымі сцягамі да месца, на якім калісьці стаяў дом Каліноўскіх. Цяпер на падмурку яшчэ стаіць вясковы дом, аднак большая частка ўжо пакрылася зямлёю, з якой дзе-нідзе прарастаюць парасткі дрэў.

Над падмуркам дома кіраўнік ініцыятывы Беларуская Нацыянальная Памяць Анатоль Міхнавец сказаў некалькі слоў пра самога Кастуся Каліноўскага і пра паўстанне, якім ён кіраваў. „Вельмі важна тое, што ў дзень, калі пачалося паўстанне ў Літве і Беларусі, а таксама напярэдадні дня народзінаў Кастуся Каліноўскага мы наведалі мясціну, якая з'яўляецца святыняй для ўсіх беларусаў, — адзначыў Анатоль Міхнавец. — Кастусь Каліноўскі — чалавек, які загінуў у 26 гадоў, змагаўся, кіраваў, быў ідэалістам, рамантыкам і яго памяць вартая таго, каб мы пра яго памяталі. Наша памяць мусіць будавацца на сапраўдных героях і праўдзе, а не на міфах і казках. Калі мы будзем шанаваць сваіх герояў тады і Беларусь «зойме свой пачэсны пасад між народамі», як пісаў Янка Купала".

За 17 гадоў незалежнасці Беларусь ніякім чынам не паспрыяла ўшанаванню памяці нацыянальнага героя Беларусі Кастуся Каліноўскага на месцы, дзе ён нарадзіўся. Па-ранейшаму беларуская грамадскасць спрабуе сваімі высілкамі аднавіць справядлівасць.

Задума ўшанаваць месца, дзе нарадзіўся кіраўнік паўстання 1863-1864 гадоў у Літве і Беларусі, узнікла яшчэ ў 1991 годзе сярод прадстаўнікоў беларускай інтэлігенцыі на Беласточчыне. Аўтарам ідэі быў бацька прафесара Алега Латышонка: „Тады дамовіліся з мясцовымі жыхарамі, што такі помнік паўстане, але мой бацька неўзабаве памёр і не было каму гэтым заняцца". Ён лічыць, што на падмурку трэба паставіць валун з надпісам: „Кастусю Каліноўскаму. Суродзічы".

Мастаўлянін Уладзімір Зарэцкі, што суправаджаў гасцей, прыгадаў нават легенды, што распавядалі ў вёсцы пра Кастуся Каліноўскага. „Старэйшыя людзі пасля вайны ўжо расказвалі пра Каліноўскага, што як ішоў на пагібель, то дзеўчына, ці нарачоная, кінула кветкі яму пад ногі, каб яму лягчэй гэтая смерць прайшла, дык яе праўдападобна побач з ім і павесілі, вось так гэта расказвалі. Ці гэта праўда, ці легенда, не ведаю, але так у вёсцы ў нас старшыя людзі расказвалі".

Яшчэ адна легенда, якая трывала засела ў свядомасці на Беласточчыне, — „Каліноўскі забіваў праваслаўных беларусаў", з ёй сутыкнуліся, па словах Алега Латышонка, яшчэ падчас першай спробы ўсталяваць валун у Мастаўлянах. „Тады паразумеліся на грунце таго, што ўсе мы беларусы. Перш за ўсё — нікога Каліноўскі не рэзаў, — сказаў спадар прафесар. — Так, паўстанне 1863-1864 гадоў было вялікім выпрабаваннем для нашай нацыі. Яно мела ў нейкай ступені форму грамадзянскай вайны, але Каліноўскі змагаўся за Беларусь. І таму трэба нам ушаноўваць памяць кожнага, хто за нашу Бацькаўшчыну стаяў".

Памяць пра Каліноўскага жыве яшчэ ў народных легендах, але павінна яна ўвасобіцца і не толькі ў памяці, але і ў помніку, а ў перспектыве і ў аднаўленым доме Каліноўскіх. Колькі ж яшчэ „ўсадзьбаў Суворавых" будзе аднаўлена, пакуль беларусы пачнуць шанаваць сваіх герояў?

Тэкст і фота Зміцера КОСЦІНА

Калі табе больш за пяцьдзесят

Думка, каб неяк разабраць па частках праект нашага ўрада „50+" мільганула мне на другі дзень падрыхтоўкі да каланаскопіі. Хто такое абследаванне праходзіў, то ведае ў чым справа. Калі прытым пад канец дня пачаў я пры нагодзе падрыхтоўкі наракаць на сам праект, то жонка сказала мне забыць праект „50+", таму што больш мне падыходзіць праект „60+".

У чым справа? А ў тым, што дзе не заглянеш, ці то ў тэлевізар, ці ў нейкую штодзённку, і то не зусім на медыцынскія старонкі, усюды табе прыпамінаюць, што калі табе больш за пяцьдзесят, то, канешне, трэба раз у год праверыць кроў на ПСА (прастатспецыфічны антыген) і з рэзультатам абследавання падацца да ўролага. Калі ён возьме чалавека ў свае кіпцюры, то візіт у яго кабінеце не скончыцца аднаразовай сустрэчай. Вызначыць ён чарговы кантрольны тэрмін — адзін, другі і т.д. Які ж мужчына, тым болей той з праекта „50+" або „60+", не хоча быць спраўны, і то не толькі для свайго задавальнення.

Далей, прынамсі раз на некалькі гадоў, абавязкова трэба праверыць страўнік і тую частку арганізма, якая падключана да страўніка даўжынёй у некалькі метраў. Апошняя праверка гэта і ёсць згаданая ўжо каланаскопія.

На гэтым не канец. Праекты прыпамінаюць, што абавязкова раз у год трэба праверыць стан сэрца, якое няспынна пампуе жыватворную кроў у наш арганізм, не зважаючы на абставіны і самаадчуванне. Калі спяшаешся, або па розных прычынах спасцігае цябе стрэс, адпаведныя органы, якія кантралююць вельмі складаны стан твайго біямеханізма, даюць сігнал, каб прыпыніцца, адпачыць і, канешне, зрабіць ЭКГ сэрца, праверыць колькі ў тваіх крывяносных артэрыях залягае непатрэбнага, бо ёсць і патрэбны, халестэрыну, і ці не тлустая твая кроў ад трыгліцэрыдаў.

Ужо без праектаў, але так сам па сабе кантралюеш вочы, бо рука надта кароткая, каб нешта прачытаць без акуляраў. Не ўспамінаю пра рукі, калені і пазваночнік, бо, у адрозненне ад іншых элемэнтаў нашага арганізма, рукі, калені і пазваночнік самі прыпомняць, што трэба імі заняцца.

Мая сяброўка Лена са здзіўленнем пытае чаму рэдка заглядаю ў „Хатку". А ці ў мяне ёсць свабодны час, калі ледзь паспяваю ў вызначаныя тэрміны ў розныя лячэбныя ўстановы згодна з графікам, устаноўленым праектам „60+" і маёй жонкай, якая не хоча слухаць нараканняў, што штосьці мне баліць. А так наогул, то хрэн з тэрмінамі і доктарамі, бо трэба ж час ад часу нейкія думкі па э-мейлу паслаць у „Ніву", і то нават не таму, што Уладзір з-пад Чаромхі заахвочвае.

Добрага здароўя ўсім чытачам жадае ваш карэспандэнт

Міхась КУПТЭЛЬ

PS. А пра тэрміны аднак не забывайце, бо не заўсёды скорая ўспее даехаць на час.

Ініцыятыва жыхароў Зубава

Усім вядома, што дэмаграфічная сітуацыя на падляшскіх вёсках незайздросная. Засталіся ў іх нешматлікія земляробы. Пераважную большасць вясковага насельніцтва складаюць ужо пенсіянеры, якіх час ад часу наведваюць гарадскія дзеці і ўнукі. Але яшчэ 30-40 гадоў таму бурліла ў іх жыццё — апрача штодзённай сялянскай працы разгортвалася багатая культурная дзейнасць пры падтрымцы мясцовай школы і грамадскіх арганізацый. Так было і ў Зубаве Бельскай гміны.

Каб не адышлі ў забыццё людзі і здарэнні, жыхары Зубава вырашылі сабраць даўнія дакументы і здымкі, запісаць свае ўспаміны і такім чынам стварыць кнігу пра сваю вёску. З такой ініцыятывай выйшаў ураджэнец Зубава, рэктар Вышэйшай менеджэрскай школы ў Беластоку д-р Міхал Лісоўскі. Яго думку адобрылі жыхары вёскі на агульным сходзе. 4 лютага ў святліцы, якая змяшчаецца ў будынку былой школы, сабралася 17 чалавек. Сярод іх былі ўдзельнікі II сусветнай вайны, сведкі пасляваенных пераўтварэнняў на вёсцы, напрыклад, былая настаўніца Марыя Вязоўская, якая ўсю сваю педагагічную дзейнасць звязала з Зубавам і Кожынам. Паабяцала яна падзяліцца сваімі ўспамінамі і знайсці дзённік свайго цесця, які запісваў найважнейшыя здарэнні з жыцця вёскі. Кніга не абміне ўвагай выхадцаў з вёскі, сярод якіх былі лётчыкі (Аляксей Дмітрук), настаўнікі (Аляксей Карпюк), журналісты (Аляксей Карпюк), паэты (Уладзімір Данілюк, Жэня Мартынюк). Каардынаваць працу па зборы ўспамінаў будуць солтыс Рыгор Кананюк і Уладзімір Паўлючук. Сабраныя за дапамогай у запісанні ўспамінаў і афармленні кнігі звярнуліся ў нашу рэдакцыю.

Пасля выхаду кніжкі адбудзецца яе прамоцыя на прымеркаваным да гэтага здарэння інтэграцыйным мерапрыемстве з удзелам цяперашніх жыхароў вёскі і выхадцаў.

(вл)

Нараўчанская гміна

Небяспечны кавалак

З Бандароў у Нараўку і далей вядзе ваяводская дарога. Асабліва небяспечна ехаць па ёй зараз жа за Плянтай у бок Нараўкі. Тут тры павароты. Дрэнная бачнасць не толькі з-за гэтых паваротаў. Абочыны дарогі на гэтым кавалку ў зарасніках.

Радны з Новага Ляўкова гаварыў пра гэта на сесіі Гміннай рады ў Нараўцы. Войт выслаў пісьмо ў Падляшскае праўленне ваяводскіх дарог у Беластоку. Прыйшоў адтуль адказ, што абочыны неабходна добраўпарадкаваць і гэтак далей. Было гэта ў лістападзе 2008 года і ППВД нічога яшчэ да гэтай пары не зрабіла. Дарожная служба катаецца амаль штодзень. 29 студзеня „латалі" дзіркі ў асфальце на чыгуначным пераездзе ў Плянце. Зараз добрая пара „касіць" хмызняк на абочынах дарог! Чакаем!

(яц)

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка
для дзяцей і моладзі

Калі немагчыма зляпіць снегавіка

Святліцу ў Старым Ляўкове наведала я ў час „Маскараднага балю". Шчыра кажучы, яшчэ не так даўно гэтае месца асацыявалася мне са святочнымі пагулянкамі ці вялікімі танцамі з нагоды найбольшага парафіяльнага свята, „на Патра". Зараз штораз часцей заходжу сюды, каб паглядзець якія мастацкія цуды ствараюць дзеці ў час заняткаў па ляпенні з гліны, пячэнні каравая ці буслінай лапы.

Пра баль даведалася я зусім выпадкова. Шпацыруючы па Бэрнацкім Мосце, вёсачцы, дзе сярод пажылых жанчын жывуць зараз двое малечаў, сустрэла суседку.

— А я зараз вязу сваю Зульку на баль, — сказала мне яна.

— На баль? — пытаюся са здзіўленнем.

— Так, у святліцу. „Маскарадны баль". Калі адбываецца раз у год, то завязу малую, няхай і яна пагуляе.

Селі на ровар і паімчаліся пяць кіламетраў.

А на балю пару дзесяткаў дзяцей з Ляўкова і ваколіцы. Конкурсы, узнагароды, гульні і танцы. Танцуюць арганізатары і бацькі, калі хто з бацькоў стоміцца — пойдзе заварыць сабе кавы, адпачне ды далей гуляе. Дзеці прыгожа пераапранутыя, хто як змог, але галоўнае, што былі касцюмы і ахвота гуляць. Галена, кіраўнік святліцы, як заўсёды бегае туды-сюды, пераймаецца нават такім малым балем. Удалося мне спытацца пра цікавыя падзеі ў святліцы.

— Ведаеш, глянь, там на дзвярах усё напісана, што, як, калі, — сказала з вясёлай усмешкай. — Мне так здаецца, што на зімовыя канікулы то нават маем цікавейшую праграму, чым у Нараўцы, — дадала шэптам. — Прыязджай!

І пабегла. Заглянула тады я на гэтыя дзверы, а там поўная праграма на два тыдні, прычым звычайных святліцовых заняткаў сапраўды няшмат. У іх месца, побач „Маскараднага балю", напрыклад, заняткі па журналістыцы! Адмыслова дзеля іх прыехала журналістка з Гайнаўкі. У час канікул можна было сустрэцца таксама з паліцыянтамі ці памежнікамі ды спытацца пра іхнюю цяжкую працу, а і даведацца чагосьці новага. Ляўкоўскія дзеці пасябравалі таксама з аднагодкамі з Орлі, якія наведалі Старое Ляўкова. Каб сяброўства было поўнае, ляўкоўцы паехалі ў Орлю на турнір пінг-понга. Адпачываючы ў святліцы, можна было таксама пакарыстацца прапановай выезду ў Беласток, але не ў кіно ці гандлёвую галерэю, а проста пакатацца на беластоцкім катку. І ўрэшце тое, чым Ляўкова паўсюль ганарыцца: ляпенне з гліны. У час канікул адбыўся таксама адкрыты конкурс па гэтай даволі цяжкай галіне мастацтва.

Толькі пазайздросціць малым ляўкоўцам. А што рабіць старэйшым? Паказаць, што можна зрабіць шмат, толькі трэба хацець і крыху падумаць. А тады і зіма без снегу нястрашная.

i_basovka@o2.pl

Цацачная кніжка для дзяцей і дарослых

Кніжка „Як выскочыў воробій" — цудоўная крыніца. Яе змест складаюць калядкі, калыханкі, дзіцячыя песні, вершыкі, лічылкі, прыбуткі. Яны друкуюцца на мове вёсак, у якіх былі запісаны: Градалёў, Грабаўца (каля Бельска), Грабаўца (каля Дубіч-Царкоўных), Арэшкава, Рыбалаў, Студзіводаў, Рудутаў, Галадоў, Маліннік. Кніжка адрасаваная беларускім дзеткам і іх бацькам ды дзядам з Падляшша. Яе аўтары — нашы продкі. Многія з іх узніклі даўным-даўно. Чытаем іх змест і дакранаемся дахрысціянскіх часоў, калі новы год (новае лета) адзначалі разам з прыходам вясны. Таму ў калядках сустрэнем пасланцоў вясны: ластавак, жураўлёў, буслоў.

Падумаеце — навошта вам такая старая „цацка" ў сучасны дзень. Не лепш уключыць відзік з ангельскамоўнай казкай? Або прачытаць тую ж самую кніжку на польскай мове? Іншы стане прапанаваць, каб такі матэрыял адразу перакласці на польскую або літаратурную мову. Бо гэтак будзе зразумела! Не! Тут ідзе пра іншыя справы. У старых вершыках і мелодыях закладзеная адукацыйная мэта — выхаваць дзіця ў здаровым, добрым духу. Я сама нядаўна праверыла іх моц на трохгадовай хроснай дачушцы Тамары. Зараз яе ўлюбёным творам з'яўлецца лічыка-гульня пра жорсткую „Сароку-варону". Гэты „вершык" смела можа канкураваць з французскамоўнымі фільмамі, якія любіць дзяўчынка. Укладальнікі нашай кніжкі, спадарства Елізавета і Дарафей Фіёнікі, таксама сваімі кансультантамі палічылі сваіх сынкоў Максіма і Ільятку ды дзяцей спадарства Марысі і Міраслава Здрайкоўскіх — Міколку і Аляксандра. Кніжка „Як выскочыў воробій" захапляе малюнкамі, якія зрабіў, менавіта, мастак Міраслаў Здрайкоўскі.

Не меншая роля тут грамады, якая запісала тэксты. Сярод іх — прадстаўнікі ўсіх пакаленняў ад вядомага фалькларыста Сцяпана Копы па моладзь з этнагурту „Жэмэрва". Тут аж просіцца адна падказка. Пры нагодзе наступнага выдання варта ўзбагаціць кніжку яшчэ кампакт-дыскам з прапанаванымі песнямі. Але і так не трэба лепшага падарунку для свайго дзіцяці або хросніка (у якасці валачобнага!).

Невыпадкова кніжку называем крыніцай. Яна дзейнічае як добрае пажаданне. Елізавета і Дарафей, даносячы кніжку да рук чытача, марылі, каб усе чытачы і аглядальнікі палічылі яе падручнікам матчынай і бацькоўскай мовы. Для старэйшых яны пажадалі вяртання ў часы дзяцінства. Нешта падобнае адбылося са мною. Калі я першы раз прачытала кніжку, мне захацелася палажыць яе пад падушку нанач. У дашкольныя гады, калі я яшчэ не ўмела чытаць, заўсёды клала пад падушку ўлюбёныя кніжкі. Тут таксама дзейнічала навука са старых часоў. Да гэтага ўчынку падмаўлялі старыя людзі, яны запэўнівалі нас, малых дуронікаў, што такім чынам кніжка сама ўвойдзе ў галаву.

ЗОРКА

Міра ЛУКША

Голуб з Галубоўшчыны

Голуб Глеб, галубка Гая
жывуць разам, як у раі.
Голуб сівы з срэбным чубам,
а як кава — яго люба,
кава з белым малаком!
У Галубоўшчыне іх дом.
Ну, а як галубяняты?
Напалову — мама з татам:
Хвост малочны дачка мае
(а завуць яе — Аглая),
крылцы — срэбрам адсвячаюць.
А які ў іх сынок,
малы франт — Герасімок?
Гальштук мае Герасім,
срэбны, а ў рэшце ён зусім
кававаценькі-малочны.
Вось які ён гожы хлопчык!
Галубоўшчыне ўсёй
падабаецца герой
верша і яго сям'я.
І ваколіца ўся,
скажам, і вёска Рагачы,
пра красу іх не маўчыць,
і ў Мілейчыцкай усёй гміне
слава галубоў не згіне!

Зося з першага „а” класа

— 18 —

Калі Зося стала вучаніцай II Агульнаадукацыйнага ліцэя, яна кінула перажываць прыдуманыя прабемы. Такой праблемай было для яе свята закаханых — „Валянцінкі”. Звычайны чалавек не ўмее знайсці сябе ў святочным шаленстве чырвані і пустых дэкларацый пра каханне. „Ці ў маім ліцэі нехта святкуе «Валянцінкі»?” — думала раніцай Зося, калі часала свае чырвоныя валасы. Сёння яна мела ахвоту памаляваць іх на іншы колер, каб не выглядаць як асоба ў карнавальным парыку.

У першым „а” класе ўсе памяталі аб амерыканскім свяце. Клара ўвесь дзень перажывала рандэву з Паўлам Пятрушэнем. Яны дамовіліся на сустрэчу ў самым дарагім рэстаране. Дзяўчына заранёў ведала, што будзе есці і як апранецца. Але найбольш здзівіў усіх Янка Рыбачук. Выхавацель прыйшоў у школу ў элегантным касцюме з букетам чырвоных руж.

— Ён закаханы ў спадарыню Ясінскую, — аб’явіў сябрам Пеця.

— Што? — абурыўся Паўл Пятрушэня. — Не можа быць! У яе ёсць ужо хлопец!

— Я чуў, што Ясінская і Рыбачук сябруюць з часоў ліцэя, — цягнуў Пеця. — Старое каханне ніколі не ржавее!

— Цікава! — прасіпеў Пятрушэня.

У дзень закаханых Ясінская, як заўсёды, была ў дрэнным настроі. Зося баялася, што настаўніца хіміі праігнаруе жэст сімпатыі Янкі Рыбачука. Але тут не было сюрпрызаў — пасля ўрокаў ліцэісты сустрэлі іх разам у цукерні Грушаня.

— Чаму іх раман так усхваляваў Паўліка? — пацікавілася Зося.

— Лепш не думай пра іх, — параіў Тамаш, — давай лепш наведаем цукерню Грушаня.

— Класная думка! — уцешылася дзяўчына.

Калі Зося і Тамаш зайшлі ў кавярню, яны не пабачылі там сваіх настаўнікаў, але затое сустрэлі іншую парачку. Іх Клара сядзела з незнаёмым хлопцам.

— А што з Пятрушэнем? — не вытрымала Зося.

— Мабыць, ён сам заслужыў на такое! — сказаў Тамаш.

— Ты пра што гаворыш?

— Паўл пэўна бегае па горадзе і сочыць за кожным крокам Ясінскай.

— Гэта смешна! — абурылася Зося.

(працяг будзе)

Тэкст: wodorotlenek92@wp.pl
Дызайн: majeszkarowu@tlen.pl

Музыка з кайфам

Далі „Далі” шанс!

14 лютага беларускі гурт „Далі” будзе змагацца за поспех у польскім адборачным туры 54-га Конкурсу песні „Еўрабачанне-2009”. З гэтай нагоды я пагутарыла з лідарам гурту Віктарам Рудэнкам.

— За вамі канцэрт у Белавежскай пушчы, у скансэне „Сяло Буды”. Як успрыняла вас там публіка?

— Файная публіка і вельмі прыемна было граць. Можна нават сказаць, што так як на радзіме, бо Белавежская пушча ёсць і ў Беларусі. Нават беларуская мабільная тэлесістэма тут працуе! А было і шмат бісаў, таму вельмі файны канцэрт.

— Чакае ўжо ваш новы альбом. Калі будзе можна ўзяць яго ў рукі?

— Альбом практычна гатовы, вырашаюцца яшчэ пытанні эканамічнага і тэхнічнага кшталту, але плануем, што ён з’явіцца восенню.

— Зараз усё круціцца вакол вашага ўдзелу ў Еўрабачанні. Адкуль рашэнне падаць заяўку якраз у Польшчу?

— Па-першае, можа таму, што ў Польшчы зайгралі мы больш канцэртаў, чым у Беларусі. Па-другое, у Польшчы можа нават больш беларусаў, чым у самой Беларусі — у такім сэнсе, што часцей чую тут беларускую мову. І, па-трэцяе, наш прадзюсар — паляк і можа лягчэй яму было тут падаць заяўку. А мне тут вельмі падабаецца і думаю, што тут нават больш прабіліся, чым у самой Беларусі, бо там былі толькі ў паўфінале, а тут ужо ў фінале.

— Вы тройчы ўжо прымалі ўдзел у беларускім Еўрабачанні. Чаму там было так складана, а тут зразу ўдалося?

— У Беларусі існуе іншы шоўбізнес, чым у цэлым свеце. Ён такі камерны і адпавядае толькі пэўнай групоўцы людзей. У шоўбізнесе павінна быць канкурэнцыя. Беларусь магла б займаць добрыя месцы ў Еўрабачанні, але тады, каб была сапраўдная канкурэнцыя і людзі працавалі. А ў нас ніхто не стараецца, бо загадзя вядома хто паедзе.

— Які для цябе гэта фестываль?

— Ведаеш, метафарычна кажучы, на пачатку трэба крыкнуць, каб пасля мець магчымасць сказаць нешта шэптам. Мы не граем такой музыкі, якая патрэбная на гэтым фестывалі.

У нас іншы фармат. Нават песня, якую прэзентуем, зусім да нас не пасуе, але павінна быць такой, каб звярнуць увагу слухача. Фестываль гэта проста добрая прамоцыя для гурту, але не лічу яго фестывалем мастацтва. Ён больш спартыўны.

— На адным з польскіх парталаў напісана: „Далі” (Польшча). Гэта мае выклікаць большы поспех з боку польскай публікі?

— Не магу адказаць на тое пытанне, бо гэта Ігар, наш менеджар падаваў заяўку. Магчыма, што яны палічылі нас палякамі, бо паляк заяўляў аб нашым гурце. Але нідзе не схавана, што мы беларусы. Нават у тэксце песні ёсць сказ на беларускай мове.

— Што параіце маладым гуртам, якія толькі што ўваходзяць у рытм музычнага жыцця?

— Біцца, біцца за сваё мастацтва, гэта няпроста.

— За мастацтва ці за папулярнасць?

— Нельга зарабіць грошы, калі ты не займаешся мастацтвам. Гэта мусіць падабацца табе і іншым.

i_basovka@o2.pl

Польска-беларуская крыжаванка № 7

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку”. Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 3:

Зрок, збан, ваш, голлі, журы, Парыж, Ас, бант, кола, жанр, шалік. Вяз, знак, бар, пан, жанр, гурт, лыжка, бал, Оля, Італія, на, сак.

Узнагароды, аўтаручкі, выйгралі **Ася Стоцкая, Матэвуш Крук, Юстына Тамашук, Марыёля Анішчук** з Дубін, **Агнешка Мароз, Агата Грыгарук** з Гайнаўкі, **Рафал Вакулюк** з Арэшкава, **Эдыта Маркевіч** з Бельска-Падляшскага. Віншуем!



Нашчадкі Вялікага Княства Літоўскага

Тэкст і фота Ілоны КАРПЮК

— Не спадзяваліся, не спадзяваліся, што будзе так файна, — сказала мне старшыня Аб'яднання бацькоў АБ-БА Барбара Пякарская адразу пасля завяршэння першага этапу праекта „Вялікае Княства Літоўскае — наша супольная спадчына".

„А што мела сказаць?" — можна спытацца. Але ведаю, што пры гэтага роду эксперыментах, менавіта на людзях, можа атрымацца і няўдача. Нібыта праца з дзяцьмі, таму мусіць быць эфект; з другога боку фундамент, на якім АБ-БА і Дом літоўскай культуры з Пунска вырашылі будаваць узаемаразуменне, не такі моцны, бо адной гісторыі ў выпадку розных нацый проста не існуе.

Ідэя праекта ўзнікла вельмі хутка

... і нечакана. Сімпозіум „Варта спытаць пра культуру", які прайшоў восенню ва Усеагульным універсітэце імя Яна Юзэфа Ліпскага ў Тэрэміскаx, прыцягнуў людзей, якія штодзённа пытаюць перад усім сябе пра сваю культуру. Сустрэча актыўных беларусаў і літоўцаў спарадзіла ідэю пазнаёміць дзяцей абодвух меншасцей, каб, мабыць, гэта яны пасля будавалі новую якасць кантактаў.

З аднаго боку чую гутаркі літоўскіх дзяцей, а ў другое вуха ўваходзяць мне польскія галасы. Мяняю партнёра ў дыскусіі і ўжо гаворым па-беларуску. Але мая суседка кажа, што ў адрозненні ад сяброў з Пунска беларускія дзеці ў большасці гавораць па-польску. Бываюць выключэнні, але іх няшмат.

Супольнай беларусам і літоўцам можа здавацца сёння спрэчка за Вялікае Княства Літоўскае ці тоеснасць Вільні. На іншыя тэмы амаль увогуле не вядзецца гаворка, таму хтосьці ўрэшце павінен пачаць канструктыўную размову. Чаму не пачаць з дзяцей. Калі ўжо Тэрэміскі спалучылі грамадскіх дзеячаў, таму вырашылі яны вярнуцца там з дзяцьмі і пачаць гэты „рызыкоўны" праект. А справа ў тым, каб пачаць гаварыць, слухаць і вучыцца сябе ўзаемна.

Уваходжу ў залу,

дзе гуляе ўжо літоўска-беларускі дзіцячы форум. Апякунка беларускіх дзяцей Аліна Ваўранюк нешта ўсім тлумачыць, да таго на беларускай мове.

— Гэта ўзаемныя курсы па мове? — пытаюся з усмешкай і зацікаўленнем. Аліна глядзіць на мяне праз момант і з разгубленасцю кажа:

— Ну, бачыш, тут такая справа, што беларускую мову нашы госці з Пунска амаль поўнасцю разумеюць, але мы, на жаль, літоўскай — не.

— Бо ваша мова вельмі блізкая польскай, — кажа мне пры вячэры малая літоўская суседка, — таму нам лёгка вас зразумець, а часам нават зусім гаворыце па-польску.

— А вы як між сабою размаўляеце?

— Па-літоўску. Часам у школе гаворым на польскай мове, бо вучацца з намі палякі, але між сабой толькі па-літоўску.

— Зайздрошчу літоўцам, — кажа ўрэшце, — яны гавораць толькі і выключна на літоўскай мове.

Зайздрасць і амбіцыю

пабачыла я таксама ў вачах беларускіх апякунак. Яны ўвесь час на полі бою за беларускамоўнасць уласных дзяцей. Прытым сваёй працай яны стараюцца пераканаць іншых бацькоў, што можна сёння быць у Польшчы беларусам, так як і літоўцам, які не сароміцца гаварыць на сваёй роднай мове. Але не толькі мова з'яўляецца штуршком для канфрантацыі. Гэта перш за ўсё вялікая гісторыя, якую ў час першай сустрэчы прадстаўляў дзецям беларускі гісторык Алег Латышонак. Без такой размалёўкі немагчыма зразумець, што ў мінулым беларусаў і літоўцаў нешта спалучала, а без кантактаў і ведаў не зразумець, што спалучае іх нешта да сённяшняга дня. Гэта, аднак, не адзіная сустрэча са спецыялістам, бо перад дзяцьмі яшчэ курсы па гісторыі з літоўскім даследчыкам. Але ўжо першая сустрэча выклікала дзіцячыя рэакцыі.

— Наша гісторыя розніцца ад гэтага, што сёння мы пачулі, — пракаментавалі маладыя літоўцы.

Апякунка літоўскіх дзяцей Аста Печуліс таксама свядомая таго, што гістарычны фон мае розныя адценні і не так лёгка будзе працаваць на гэтай сярэднявечнай аснове.

— Помню, калісьці прыехаў адзін мужчына і кажа, што ён з Беларусі і ў размове высвятляе, што Беларусь была ад мора да мора. Тады я ўпершыню сустрэлася ўвогуле з беларусам. Не магла я аднак зразумець, чаму ён так кажа.

Прыйшло аднак зразуменне

— Калі я пазнала беларускае асяроддзе ў Беластоку, аказалася, што наша гістарычная Літва гэта таксама беларуская спадчына, — дадае Аста. — Аднак ніколі не вырашымся з гэтымі розніцамі, бо ніколі не будзе адной супольнай гісторыі. Літоўцы — у сваёй — толькі ўспаміналі пра беларусаў, а калі слухаем расказы беларусаў, то аказваецца, што гэта зусім іншы пункт гледжання.

Сустрэча з прафесарам Алегам Латышонкам паказала аднак, што можна працаваць з дзяцьмі ў цікавы спосаб і звяртаць увагу перш за ўсё на факты, якія змешчаны ў пісьмовых крыніцах, бо, як паўтарае Алег Латышонак, гісторыя ёсць тады, калі ёсць дакумент. Такім духовым дакументам новай гісторыі беларуска-літоўскіх кантактаў напэўна будуць веды пра культуру новых сяброў.

— Яшчэ перад праектам дзеці напісалі, што хочуць пазнаць новыя песні, танцы, — эмацыянальна расказвае Аста, — спадзяваліся навучыцца плесці паяскі ды іншых навучыць рабіць крайку.

Я сама з прыемнасцю навучылася танцаваць літоўскую „ойру", а дзеці раз'ехаліся, ведаючы некалькі танцаў ды песень. Хаця спачатку прынята было, што ўсе, дзеля разумення, будуць старацца гаварыць па-польску, то жыццё паказала, што гэта проста не мае сэнсу. Між сабою гаварылі як звычайна, як прывыклі, да новых сяброў часам з мусу звярталіся па-польску, галоўнае аднак, што знайшлі супольную мову ў культурным кантэксце.

Калі спытацца ў іх дзеля чаго сустрэліся, некаторыя задумваюцца і спрытна адказваюць, што гэта самае цяжкае пытанне, а на такія адказ знайсці нялёгка. Але ж гэта дзеці...

Спадзяемся на новых сяброў.

Напэўна на новыя веды!

— Хочам чагосьці даведацца, але і навучыцца, — таргаваліся.

І гэта, здаецца, сутнасць спаткання. Пазнаць нешта новае, а перш за ўсё другога чалавека.

— Калі дзеці толькі што выйшлі з аўтобуса, дзяўчаты адразу заклікалі жыць у пакоях толькі ў сваім крузе. Гэта такое натуральнае, характэрнае. Але можа і такі несвядомы страх перад іншымі, — каментавала літоўская апякунка.

Калі дзеці маюць у сабе нейкі, нават неакрэслены, страх, варта прабаваць справіцца з гэтай дыстанцыяй. Не без уплыву на гэта ўмовы жыцця ў меншасці.

— Як меншасць мы жывём пад свайго роду каўпаком. Некаторыя кажуць, што гэта дрэнна, але гэта мае і свае станоўчыя рысы, хаця б факт, што мы не загінулі праз апошніх восемдзесят гадоў, — тлумачыць Аста. — Жыццё ў меншасці выклікае вялікія праблемы, нібыта абавязвае заканадаўства па справах меншасці, але вядома, што найлепш жыць у сваёй краіне. Але, пэўна так як вы, так і мы ніадкуль сюды не прыехалі і не збіраемся выязджаць. Гэта наша месца.

Чаму тады, жывучы ў адным рэгіёне, не рашаемся стварыць форум для дыялогу паміж меншасцямі. Адказ можа быць просты: мы ўсе жывём пад сваімі абажурамі, жывём у акрэсленых кругах: літоўскіх, беларускіх, татарскіх, украінскіх. Адзінае, чым займаемся, гэта „наша справа"! Але наша справа — гэта таксама быць разумным, рэфлексіўным, адкрытым, пазбаўленым нацыянальных прадузятасцей. Не ўсе пакаленні ў змозе з гэтым справіцца, але ў дзецях — надзея.

— Ведаеш, нашы дзеці нават пасылаюць сабе эсэмэскі, значыцца, ёсць эфект, — дадае настаўніца Аліна Ваўранюк.

А гэта толькі пачатак, першая сустрэча. Знаёмства будзе працягвацца перш за ўсё ў рамках праекта „Вялікае Княства Літоўскае — наша супольная спадчына". ВКЛ гэта аднак толькі пункт выхаду, такі штуршок. Затое месца спынення на карце праекта не пабачым, бо вызначыць яго жыццё. А дзеці ўжо перадумалі справу і вырашылі з літоўскімі сябрамі сустрэцца таксама ў час канікул!

Арлянскае яўрэйскае мінулае

Міхал МІНЦЭВІЧ

У Орлі няблага жылося людзям да прыходу сюды акупантаў. У савецкі час, у 1940 годзе, не ставала тут цукру і мыла, а багацейшых яўрэяў і мясцовых гаспадароў НКВД ссылала ў Сібір. Беспаспяхова завяршылася агітацыя за перасяленне мясцовых у глыб СССР і з Орлі дабравольна выехалі толькі дзве сям'і. У завяршэнне свайго панавання, 24 чэрвеня 1941 года саветы расстралялі сямёра невіноўных арлян, а пахаванні адбыліся без бацюшкі. Аднак, некаторым жанчынам салдаты падабаліся, з чаго адбылося некалькі родаў. Чарговыя гады прынеслі найбольшую яўрэйскую трагедыю, аднак я хачу засяродзіцца на ўкладзе старазапаветных у развіццё мясцовасці, якія ўнеслі вырашальны ўклад у яе ранейшае жыццё.

Фота з хатняга архіва Міхала МІНЦЭВІЧА

Вятрак Янкеля ў даваеннай Орлі і далей ягоны дом

Яўрэі жылі ў Орлі на працягу некалькіх стагоддзяў. Былі яны не толькі рухавіком развіцця мястэчка, але і стрыжнем ягонай экзістэнцыі. Сёння ад багатага яўрэйскага мінулага асталіся выдатная сінагога (усё руйнаваная ў выніку незавершанага рамонту) і запушчаны кіркут. Асталіся таксама пасляяўрэйскія будынкі, якіх большасць зараз у прыватным уладанні. У рынку стаіць апусцелы будынак былой пякарні, якой уласнікамі была яўрэйская сям'я Ізбуцкіх; раней была там геэсаўская крама, а зараз сезонна карыстаюцца яго высокім комінам буслы. Як мне нядаўна расказаў спадар Ежы Ёдла з Бельска, Юзаф Ізбуцкі (адзіны яўрэйскі мужчына з Орлі, які выжыў у вайну „дзякуючы" вывазцы ў глыб СССР) нейкі час пасля вайны вёў пякарню, а пасля прадаў будынак ГСу. Асталося некалькі жылых дамоў (якія яшчэ нядаўна былі гмінай уласнасцю, а зараз перабудаваны і адрамантаваны), асталіся будынак старой мясарні з 1935 года (зараз прыватная пустая ўласнасць), будынак млына (які таксама цяпер прыватны, а да нядаўна быў уласнасцю ГСу), вытворчыя і жылыя будынкі (зараз яны ўсе прыватныя) былой кафлярні Вайштынаў. Ад Лявона Байко ў Орлі даведаўся я, што ў 1945 годзе на кароткі час наведалі Орлю жанчыны з сям'і Вайштынаў (яны былі вывезены ў Сібір). Пабачылі яны разбураную і разграбленую сваю маёмасць і... спадар Байко адвёз іх фурманкай у Бельск; яны цераз Францыю выехалі ў Ізраіль. У 1980-х гадах прыязджалі ў Орлю іх нашчадкі, колішняй служанцы прывезлі нейкія падарункі; пра вяртанне іх маёмасці ў грамадстве амаль не было гаворкі.

Зместам даваеннага жыцця арлян былі гандаль і рамяство. Патрабаванні і ўклад жыцця вызначалі развіццё канкрэтных рамёстваў, якія з часам ішлі на спад. Чарговыя стагоддзі ўносілі рашучыя змены.

З перапісу падаткаплацельшчыкаў горада Орля ад 1803 года, а было іх тады 389 асоб, можам даведацца, што працавалі тут м.інш. саладоўнік, рыбнік, кантар, капялюшнік, пазалотнік, галуншчык, фарбавальшчык, цырульнік, пераплётчык, галільшчык, півавар ці шынкар (апошніх было найбольш). З ліку тадышніх прафесій да сённяшняга дня ніводная на практыцы не захавалася, ды і з нядаўняга дваццатага стагоддзя зусім мала. Часта прафесіі занікаюць запар са смерцю ці хваробай рамесніка і на гэта таксама можна прывесці прыклады з арлянскага побыту — зараз няма ўжо ў Орлі кавалёў, кушняроў, печнікоў, бондараў, ткачых палавікоў, вытворцаў саламяных мат, якімі яшчэ нядаўна славілася на Падляшшы арлянская зямля. Намнога раней перасталі працаваць брукары і каменшчыкі, няма каняводаў, ветэрынараў і нават музыкаў. Кожны з былых майстроў сваёй меншай ці большай руплівасцю прыкладаўся да арлянскага дабрабыту.

У запісе арлянскай гісторыі агромную ролю адыграла і надалей іграе „Ніва". Вядома мне, што людзі цешацца, калі пішацца пра іхнія мясцовасць і насельніцтва, асабліва ж пра мінулае, па якім нярэдка тужаць, бо прыгадваюцца іх продкі і яны самі, калі былі яшчэ маладымі. А я, як ураджэнец Орлі, сваімі запісамі мацую памяць пра людзей — гэта такі доўг перад імі...

Дзякуючы маёй дапытлівасці і адкрытасці маіх субяседнікаў, удалося мне даволі верагодна ўзнавіць кругагляд санацыйнай Орлі, яе рамесніцкае выяўленне і галоўныя яго фігуры, ды ўстанавіць мапу з разметкай, дзе яны жылі і дзейнічалі.

Пры санацыі не было беспрацоўя, бо людзі ў прынцыпе жылі сціпла і не было гонкі за прыбыткам. Хто хацеў, той меў занятак, бо нават дзеці менш займаліся навукай, калі трэба было дапамагаць бацькам у полі ці пасвіць свіней. Частка арлянскіх аўтахтонаў працавала ў яўрэйскай кафлярні, частка на сваіх гаспадарках, некаторыя былі заняты на службе ў яўрэяў ці бацюшкі. Былі таксама і хрысціянскія спецыялісты: шаўцы, кавалі, сталяры, студнякопы (варта заўважыць, што ў аўтахтонаў пры студнях былі жоравы, а ў яўрэяў калаўроты). У 1935 годзе пасяліўся ў Орлі фатограф Барлог, каталік, які жыў тут да вайны, ягоная жонка працавала бібліятэкаркай у школе. Варта таксама помніць, што пры санацыі дыскрымінавалі праваслаўных і не прымалі іх на працу ў адміністрацыі, паліцыі ці школе, хаця ў Орлі было адно выключэнне: настаўнікам працаваў Васіль Лашкевіч.

Немагчыма забыць, што ў міжваенны час у люднай гандлёва-рамесніцкай Орлі быў доўгі перыяд, калі не бракавала бядоты і нэндзы. І вось, пакінуўшы па-за ўвагай найтрагічнейшыя паслябежанскія эпізоды, узнікла ў мяне адна рэфлексія. Агульна вядома, што чалавек мацнейшы за каня — у тым сэнсе, што каня можна хутчэй чым чалавека замучыць. Да таго ж даказана, што на доўгіх дыстанцыях чалавек больш выносліў за сабаку: чалавек пабяжыць далей, калі сабаку не стане сіл. І вось, нягледзячы на сказанае, у цяперашні наш час нам складана ўявіць, як калісь магчыма было хадзіць басанож працягам за паўгода. Мяркую, што цяперашняе пакаленне не вытрымала б такой нагрузкі!..

— З маленства я ўжо дапамагаў бацькам, — успамінае Яраслаў Адзіевіч, народжаны ў 1927 годзе. — Я пачаргова пасвіў коней, кароў, свіней — і то басанож! Як разбуешся вясною, то так аж да позняй восені. Басанож гной вывозілі, басанож аралі. А пакалечаныя ногі пяклі! І як людзі ішлі ў царкву, то перад храмам абувалі хто там што меў...

— У 1921 годзе пайшоў я ў школу, — успамінаў Арсень Лушч з Кашалёў, народжаны ў 1913 годзе. — Усе дзеці хадзілі басанож. Хадзіць у школу бацька пашыў мне шнураваныя лапці. Калі настаўнік Врублеўскі пабачыў іх, жахнуўся і падарыў мне сапраўдныя боты. То я ад радасці зняў лапці і з тымі ботамі на плячах прыбег басанож па снезе дадому! Цяпер у нас расхвальваюць санацыю, аднак жыццё ў нас тады было нэндзнае. Такая праўда!..

— Яўрэяў у Орлі было каля дзвюх тысяч душ, але зямлю з іх ліку абраблялі толькі дзве сям'і: Шэпы і Вельвель-Хадак, — успамінаў Уладзімір Здановіч, народжаны ў 1921 годзе. — Жылі яны край сябе па вуліцы 3 Мая з боку Кашалёў. То іншыя жыды гаварылі пра іх, што яны дурныя. А той Вельвель купляў кожны кавалачак поля, прыгаворваючы, што зямля есці не просіць.

Для жыцця неабходны хлеб, а той з мукі. Бяднейшыя людзі малолі збожжа ў жорнах, а не ўсе гаспадары мелі такія прылады. У тым часе ў Орлі былі чатыры ветракі (сёння па іх сляды прапалі) і вялікі млын, які працуе і зараз.

— Уладальнікам вадзянога млына на Арлянцы, пры драўляным мосце ў пачатку мястэчка, быў пасля першай сусветнай вайны нейкі Серацкі, — успамінаў Рыгор Бобер, млынар з Міклашоў, народжаны ў 1941 годзе. — Пры маёй памяці ў млыне ўжо не было млынавога воднага кола — была ў ім вадзяная турбіна. Працавалі ў ім Серацкі, ягоны брат-разводнік ды швагер-бабыль. Бадай у 1924 годзе, у выніку пажару, млын быў знішчаны. Але Серацкі быў на нашай тэрыторыі лоўчым, быў знаёмы з многімі важнымі чынамі, у тым ліку і са старостам, якія часта ў яго гасцявалі. Зараз атрымаў ён вялікую кампенсацыю, купіў у Гайнаўцы матэрыял і ў 1925 годзе пачаў будову новага млына. Майстрам-сталяром быў нейкі Заянчкоўскі, а яго памочнікам Лёва Нестаровіч, абодва з Орлі. Побач млына пабудавалі яны і вялікі жылы дом (раней кватэра была ў млыне і менавіта ад яе і пачаўся пажар). Млын Серацкага меў вялікі завоз да часу вялікага гаспадарчага крызісу. З яго настаннем Серацкі траціну млынавых паёў уступіў яўрэю Арціку Галавескаму. У 1928 годзе Серацкі стаў войтам, а паі Галавескага сталі мяняць уласнікаў: прыдбаў іх яўрэй Грабскі з Белавежы, які да суполкі ўзяў яшчэ яўрэя „Табачніка". Паставілі тады ў млын два дадатковыя вальцы, купленыя ў варшаўскай фірме Лянгерскага. Млын прыводзіла ў рух вада, але калі наступала большая нагрузка і ў рацэ не хапала вады, то яўрэі паставілі яшчэ дадатковы дызельны рухавік, якім малолі ўдзень, а ноччу карысталіся вадзяным прыводам. Яшчэ да прыходу саветаў у 1939 годзе Серацкі прадаў сваю долю млына і выехаў у Сураж, дзе купіў новы млын, маторны. Забраў ён за сабою на працу і арлянскага млынара Мікалая Хурсу, родам з Вулькі. Пры саветах млын у Орлі быў нацыяналізаваны, а загадчыкам яго стаў яўрэй Ляцкі, брат арлянскага дантыста.

Дадам, што згаданыя чатыры ветракі стаялі ў полі за Орляй у напрамку Рудутаў. Уладальнікамі іх былі Іван Харуеў (які з сынам, таксама Іванам, усе іх пабудаваў), Нікіфар Багацэвіч, Шурка Марцінюк ды яўрэй Янкель, які жыў недалёка ад свайго ветрака, а ягоны дом стаіць да сёння. Людзі згадваюць, што быў яшчэ адзін вятрак на ўчастку суседнім з тым, на якім пазней быў геэсаўскі свінарнік (прадаўжэнне вуліцы Жвіркі і Вігуры). Да сёння ўцалеў толькі вятрак Харуева, які шмат гадоў таму разабралі і перанеслі ў белавежскі скансэн.

У цэнтры Орлі, у недалёкай ад сябе адлегласці, былі чатыры яўрэйскія пякарні (сёння здаецца, што гэта многа, але тады ж у Орлі было каля трох тысяч насельніцтва; цяпер у Орлі адна пякарня на тысячу спажыўцоў). Пякарскія вырабы куплялі часткова і жыхары навакольных вёсак. Сёння можна сабе ўяўляць і марыць, як калісь пахла ў рыначку хлебам, калі адначасна выпякалі яго ўва ўсіх пякарнях... Дзве з іх месціліся па вуліцы Кляшчэлеўскай насупраць парку. Першая, якой уладаль-

працяг ☞ 11

Імпрэза ў Таварыстве беларускай культуры ў Літве

Старшыня ТБК Хведар Нюнька распавёў пра юбілей — 90 год з дня заснавання Віленскай беларускай гімназіі (ВБГ). Быў паказаны багаты дакументальны матэрыял. Заснавальнікамі гімназіі былі кс. Адам Станкевіч, Іван Луцкевіч, Алёна Сакалова-Лекант, Юлія Мэнке і другія.

У апошнюю суботу месяца, як заўсёды, адбылася імпрэза, прысвечаная значным падзеям альбо некаторым асобам, народжаным у студзені.

Старшыня ТБК Хведар Нюнька распавёў пра юбілей — 90 год з дня заснавання Віленскай беларускай гімназіі (ВБГ). Быў паказаны багаты дакументальны матэрыял. Заснавальнікамі гімназіі былі кс. Адам Станкевіч, Іван Луцкевіч, Алёна Сакалова-Лекант, Юлія Мэнке і другія.

Гімназія размяшчалася ў Базыльянскіх мурах — гістарычным і святым для кожнага беларуса месцы.

Першымі вучнямі былі выхаванцы з прытулку беларускіх дзяцей — сірот вайны. Заснаваў прытулак кс. Адам Станкевіч. З часам ВБГ пашырылася як колькасна, так і якасна. Створаны былі самадзейныя гурткі, духавы аркестр, форма адзення, бібліятэка, друкаваныя часопісы. Выкладчыкамі былі кс. А. Станкевіч, А. Сакалова-Лекант, Барыс Кіта, Антон Луцкевіч, Максім Гарэцкі, Радаслаў Астроўскі, Канстанцін Галкоўскі. Усе яны выхоўвалі вучняў на адукаваных, нацыянальна свядомых беларускіх патрыётаў.

Асабліва вялікая заслуга належыць кс. Адаму Станкевічу. Пра яго ўспаміналі былыя вучні, а пазней відныя грамадскія дзеячы Мар'ян Пецюкевіч, Вітаўт Тумаш, Раіса Жук-Грышкевіч і другія. Вучні ВБГ праславілі беларускую культуру і мову на ўсіх кантынентах, куды закінула іх вайна.

У трыццатых гадах на беларускіх землях Польшчы адбываўся моцны ціск супроць беларускасці. Адна за адной зачыняліся беларускія гімназіі. У канцы засталася адна ВБГ і тая стала філіяй польскай гімназіі.

У 1939 годзе Вільня была перададзена Літве. ВБГ была рэарганізавана ў прагімназію (ніжэйшы ўзровень), а пазней у 1940 годзе стала звычайнай савецкай школай.

У часе нямецкай акупацыі ВБГ зноў атрымала правы поўнай гімназіі і нармальныя ўмовы працы.

У 1944 г., пасля прыходу савецкай улады, гімназія, як і ўсё беларускае жыццё ў Вільні, спыніла сваю дзейнасць на доўгі, амаль 50 гадоў, час. Настаўнікі ВБГ былі альбо арыштаваны і рэпрэсаваны, альбо засталіся без работы і вымушаны былі шукаць працу ў польскіх альбо расейскіх школах. Кс. Адам Станкевіч і Антон Луцкевіч загінулі ў сталінскіх лагерах.

Толькі з развалам савецкай сістэмы, паступова, з цяжкасцямі, пачалося беларускае адраджэнне ў Вільні. ТБК на пачатку 1990-х гадоў пачало дамагацца аднавіць беларускую школу ў Базыльянскіх мурах. Улады пачаткова абяцалі станоўча вырашыць гэтае пытанне пасля таго як для інстытутаў, што займалі Базыльянскія муры, будуць пабудаваны новыя памяшканні па вул. Саўлецкяё. Але Базыльянскія муры былі перададзены каталіцкаму архібіскупству, з якім нам, на жаль, дамовіцца не ўдалося. Пазней, з дапамогай ТБК, пад беларускую школу атрымалі будынкі дзіцячага садка, дзе і цяпер знаходзіцца беларуская школа.

Нашы планы аднавіць слаўную беларускую гімназію ў Вільні з яе традыцыямі не здзейсніліся. Цяпер другія ўмовы і сітуацыя. На жаль, тут няма тых самаахвярных беларускіх патрыётаў-настаўнікаў, што былі ў ВБГ, ды і патрыятычнае выхаванне не тое. Усё ж добра, што школа да гэтага часу існуе, калі ў самой Беларусі сітуацыя з беларускімі школамі драматычная.

Затым Алесь Адамковіч зрабіў цікавы даклад пра ксяндза Зянона Якуця — беларускага патрыёта. Ён у цяжкіх умовах польскай акупацыі змагаўся за беларускую мову ў каталіцкіх касцёлах. На жаль, кароткае жыццё (29 год) не далі магчымасці зрабіць большы ўклад у беларускую справу. ТБК ужо двойчы арганізавала падарожжа на Браслаўшчыну і кожны раз наведвала магілу кс. Зянона Якуця.

Хведар Нюнька расказаў пра асобу-легенду — Барыса Рагулю, яго шчаслівы пабег з кіпцюроў смерці — сталінскай турмы на пачатку другой сусветнай вайны. У час вайны ён на Наваградчыне арганізуе беларускі вайсковы эскадрон, які стаяў у той складаны час на баку абароны беларускага народа ад белых і чырвоных бандаў, што палілі беларускія школы, забіваючы настаўнікаў і беларускіх культурных актывістаў. Быў паказаны відэаматэрыял пра шматбаковую працу Барыса Рагулі на эміграцыі, асабліва арганізацыю навукі для беларусаў у Лювене (Бельгія), затым у Канадзе, аб працы на пасадзе намесніка старшыні Рады Беларускай Народнай Рэспублікі, пра семінар Еўрапейскага сектара Рады БНР у Вільні ў 1997 годзе, які ўзначальваў Барыс Рагуля.

У канцы быў праслуханы запіс змястоўнага выступлення Зянона Пазьняка амаль дваццацігадовай даўнасці.

Аглядальнік

http://kanstanta.net46.net

Сусветнае выяўленчае мастацтва шматграннае. Беларускае ў гэтым дачыненні не выключэнне. Тут таксама сустракаюцца неардынарныя як мастакі, так і іх творы, і абмінуць якія ўвагай папросту немагчыма.

Блуканні па Байнэце часцяком прыводзяць на „нечаканыя" сайты, як, напрыклад, інтэрнэт-прадстаўніцтва мастака Кастуся Прусава з Гомеля, што называецца „Канстанта". Нават з гэтай назвы відаць, як цікава мастак можа пайграць з уласным імем.

Сайт месціцца па адрасе http://kanstanta.net46.net і ўяўляе сабой нібыта невялікую карцінную галерэю, што мае мноства залаў і калідораў, дзе развешаныя карціны згодна з жанрам выяўленчага мастацтва. Тут ёсць жывапіс і графіка, якія маюць аднайменныя рубрыкі. Але каб перайсці на іх і зразумець мастака, пачаць трэба з галоўнай старонкі, дзе Кастусь Прусаў распавядае аб сабе. „Сюжэты карцін разнастайныя. У графічных серыях дамінуюць сымбалічныя, гратэскныя вобразы, у тым ліку, звязаныя з беларускай культурай. Работы выкананыя ў розных тэхніках жывапісу і графікі, розняцца па жанрах", — гаворыцца ў невялікім тэксце з правага боку выяўлення, дзе падаецца кароткая творчая біяграфія мастака.

Кастусю Прусаву ўсяго трыццаць гадоў, але, згодна з інфармацыяй на сайце, ягоныя карціны ўжо размешчаны ў прыватных калекцыях Вялікабрытаніі, Італіі, Кітая, Нідэрландаў, Расіі, ЗША, Украіны, Беларусі, а таксама ў зборах вядомых людзей, у тым ліку Джыны Лолабрыджыды, у Музеі рускага мастацтва ў Харбіне (КНР) і інш.

Дарэчы, з Паднябеснай мастак мае асаблівыя стасункі, бо інакш немагчыма зразумець расповеды пра тамтэйшыя выставы Прусава, анонсы пра якія месцяцца на галоўнай старонцы з левага боку. Праўда, тут выкрываецца непрыемная хіба сайта — расповеды гэтыя маюць толькі пачатак. Калі ж клікнуць на слова „далей" у канцы анонса, то трапляем мы не на працяг, а на старонку „Аб'екты", якая ў даным выпадку не мае дачынення ні да чаго з раней прачытанага.

Нічога не даведаемся мы пра ўражанні ад вандраванняў і фотаздымкаў там зробленых — такія прабелы гавораць пра тое, што ўладальніку сайта яшчэ ёсць над чым працаваць, настройваючы ўласнае інэрнэт-прадстаўніцтва.

А вось што ўжо цалкам закончана, то гэта творы, якімі аўтар перадае сваё ўспрыманне рэчаіснасці. Той гратэск і сімвалізм, што выкарыстоўвае Прусаў у іх, лепей адзін раз пабачыць, каб зразумець нетыповасць асобы мастака. Як і належыць сімвалам і гратэску, яны перадаюць з большага пачуцці чым рэчаіснасць.

Калі ж мы зноў зазірнем на вышэйпамянёную старонку „Аб'екты", то тут перад намі адкрыюцца выяўленні не карцін, а куфраў. Чыім вынікам працы яны з'яўляюцца — з інфармацыі, пададзенай на сайце, незразумела. Не выключана, што да іх з'яўлення спрычынілася рука Кастуся Прусава.

Дарэчы, мастак, відаць, спрабаваў сябе ў напісанні расповедаў, аб чым сведчыць старонка „Артыкулы". Праўда, тут уладальніку сайта таксама яшчэ хопіць працы — з трох тэкстаў даступны толькі адзін, які напісаны на рускай мове.

Сайт Кастуся Прусава шматмоўны — тут маецца не толькі беларуская, але і руская, англійская ды нямецкая моўныя версіі.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Напярэдадні галоўнага

Хакейны сезон усё больш набліжаецца да галоўнай падзеі года — чэмпіянату свету, які пачнецца ў красавіку ў Швейцарыі. Непасрэдную падрыхтоўку да яго пачала і зборная Беларусі. У досыць эксперыментальным складзе яна выправілася на месца будучага форуму і правяла ў Жэневе два таварыскія матчы. Спарынгі каманда праводзіла пад кіраўніцтвам трэнераў Эдуарда Занкаўца і Уладзіміра Цыплакова. Галоўны коўч беларускай дружыны канадзец Глен Хэнлан пакуль заняты ў сваім клубе — фінскім „Ёкерыце". Гульнёвая вандроўка на берагі жэнеўскага мора скончылася пэўным канфузам. У першым матчы нашы саступілі швейцарцам з лікам 1:3. А ў другім без варыянтаў прайгралі Славаччыне — вынік 0:4 гаворыць сам па сабе. Дарэчы, Славакія будзе адным з апанентаў Беларусі на першым этапе чэмпіянату. Рабіць катэгарычныя высновы з лакальных няўдач пакуль няварта. У прайшоўшых гульнях не бралі ўдзелу беларускія легіянеры, а таксама шэраг траўмаваных хакеістаў, якія напэўна будуць у абойме. Іншая рэч — што сапернікі да першынства свету таксама істотна ўзмоцняць свае шэрагі.

Тым часам мінскае „Дынама" бясслаўна завяршае свой першы сезон у Кантынентальнай хакейнай лізе. Магчыма і апошні, бо фінансавы крызіс праўдападобна ўжо пачаў раз'ядаць гэтую міжнародную лігу. Так, Казахстан на дадзены момант прыняў рашэнне ў наступным сезоне пакінуць усе расійскія дывізіёны і праводзіць толькі свой нацыянальны чэмпіянат. Сур'ёзным ударам па прэстыжы КХЛ стала і параза аднаго з лідараў расійскага хакея — магнітагорскага „Металурга", які ў вырашальным матчы фіналу Лігі чэмпіёнаў з трэскам саступіў швейцарскаму „Цурыху" — 0:5. З беларускіх клубаў у КХЛ рвуцца яшчэ два — „Гомель" і мінскае „Юнацтва". А ўвогуле айчынныя спецыялісты і журналісты выразна падзяліліся на два лагеры — прыхільнікаў КХЛ і скептыкаў. Удзел беларускіх „бела-блакітных" ва ўсходнім мегапраекце пакуль не натхняе. Задоўга да фінішу высветлілася, што мінскае „Дынама" ў плэй-оф не трапіць. Зараз яно пляцецца на 22-м месцы пры 24-х удзельніках.

У заакіянскай Нацыянальнай хакейнай лізе справы ў нашых майстроў ідуць парознаму. „Манрэаль" братоў Касціцыных практычна забяспечыў месца ў плэй-оф Кубка Стэнлі. А вось клуб іншага беларускага нападніка Міхаіла Грабоўскага — „Таронта" — рэальных шанцаў на гэта не мае. Досыць добры сезон праводзіць наш абаронец Руслан Салей, які мае станоўчыя паказальнікі, але яго „Каларада" таксама завіс над безданню. Найбольш галоў з беларусаў забіў Андрэй Касціцын — на яго рахунку 18 закінутых шайбаў.

Блізкі да завяршэння і адкрыты рэгулярны чэмпіянат Беларусі. Актэт, які павядзе змаганне за медалі, фактычна вызначыўся. У васьмёрку лепшых трапяць сталічнае „Юнацтва" (яно апярэджвае бліжэйшага пераследніка ажно на 21 ачко!), „Гомель", жлобінскі „Металург", магілёўскае „Хімвалакно", гродзенскі „Нёман", „Віцебск", мінскі „Керамін" і наваполацкі „Хімік"-СКА. Варта адзначыць сур'ёзны спурт нёманцаў, якія ўжо выйшлі на пятае месца, а таксама рэгрэс літаральна на вачах „Кераміна" — сёлетні чэмпіён краіны пасля фіяска ў фінальнай частцы Кантынентальнага кубка з фаварыцкіх пазіцый звалюся ў сярэдзіну турнірнай табліцы. Адна з прычын — перадсезонная рэкрутацыя моцных гульцоў у склад штучна „выседжанага" флагмана — усё таго ж „Дынама", якое ажыццяўляла свой план найперш шляхам дзяржаўнага пратэкцыянізму.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

9 ☞працяг нікам быў Шэршань, межавала з царквой (вугал Жвіркі і Вігуры); у будынку пякарні была таксама крама з півам, печанымі селядцамі, была там і сталовая.

— Жылі мы ў Малінніках, але ў царкву хадзілі ў Орлю, бо сюды нам было бліжэй чым у прыхадское Падбелле, — успамінала Тацяна Данілюк, народжаная ў Малінніках у 1911 годзе. — І як тата прыводзіў нас да споведзі, то заходзілі да яўрэя Шэршаня на печаныя селядцы, бо вельмі смачныя былі. І калі людзі прыходзілі на Усяночную, то пякарня заўсёды была адкрыта, цяпло там было, а гаспадары запрашалі заходзіць і пагрэцца. Яны дбалі, каб людзі іх любілі, бо яны ж сярод людзей жылі.

Другая пякарня, якой уладальнікам быў Цымбал (быў ён і сябрам духавога аркестра пажарнікаў), стаяла паміж будынкамі каваля Ёны і ўдавы Вадзілоўскай. Прадавалі ў ёй вельмі смачныя ражкі. Зараз на месцы той пякарні стаіць жылы чатырохсямейны будынак.

Трэцяя пякарня, якой уласнікам быў Маламэд, была найбольшай. Месцілася яна ў двухпавярховым будынку ў рыначку насупраць гасподы яўрэя Бэрка Шмаглера; сёння па тым будынку няма следу. Уцалеў затое мураваны будынак чацвёртай пякарні сям'і Ізбуцкіх, побач гасподы на рагу вуліц Спулдзельчай і 1 Мая. Пасля вайны пякарню вёў яшчэ малодшы Юзаф Ізбуцкі, пазней адкупіў яе ГС і выпякалі ў ёй хлеб яшчэ да 1970-х гадоў, да часу ўзвядзення новай пякарні па вуліцы Ажэшкі. Крыху раней прадавалі там піва, пасля была толькі мясная крама, а ад звыш дзесятка гадоў будынак пустуе (ГС яго не прадае, каб не мець канкурэнцыі). Насупраць пякарні (цяпер вугал парку) было пажарнае дэпо; побач быў жыдоўскі банк.

— У час другой сусветнай вайны саветы вывезлі Ізбуцкіх у ссылку, — расказваў мне Яраслаў Адзіевіч. — Малодшага, Юзафа, паслалі адтуль на фінскую вайну (разам з ім быў там арлянскі аўтахтон Федзька „Нікаторчык" Кубаеўскі. Пасля вяртання з Расіі Ізбуцкі пасяліўся ў Бельску-Падляшскім і, прадаўшы арлянскую пякарню, працаваў там вазаком. Вазіў ён па горадзе вугаль на вялікай двухконнай фурманцы (вугаль на чыгуначнай станцыі грузілі яму наёмныя рабочыя). Ажаніўся ён з каталічкай, памёр у 1992 годзе.

Дадам, што ў пачатку 1970-х гадоў ягоны сын Генэк вучыўся разам са мной у адной з бельскіх школ. Пасля Генэк з сястрой выехалі ў Ізраіль і там жывуць і цяпер. Два гады таму з'явілася ў мяне спадарыня Рэната Лугоўская з Бельска па мае паштоўкі з арлянскай сінагогай; прасілі іх Ізбуцкія з Ізраіля і вельмі дзякавалі за памяць пра яўрэяў.

Можам спаць спакойна

Калісьці абавязваў закон, які на жыхароў вёсак накладаў абавязак нясення начной варты. Ад абавязку вартавання былі вызвалены солтыс вёскі, сяляне, якія дасягнулі 75-гадовага ўзросту, інваліды, міліцыянеры і пажарнікі. Калі ў хаце знаходзіліся іншыя дарослыя асобы, яны таксама вымушаны былі несці варту, паколькі так рашылі сяляне на сходзе (ад каміна). Варту неслі дзве асобы ад гадзіны дзесятай вечара да чацвёртай раніцы. У адной з іх павінна знаходзіцца шыльдачка з надпісам „WARTA NOCNA" (замацаваная на драўляным калочку). Найчасцей ставілі яе побач хаты або агароджы. Чаргу назначаў солтыс паводле спіска. На наступны дзень шыльдачку пераносілі суседу і паведамлялі: „Сёння ў вас з суседам варта". Міліцыянеры часам правяралі вартаўнікоў. Зачым пайшлі да солтыса, шукалі перш-наперш шыльдачку, затым вартаўнікоў. Да абавязку вартавання сяляне ставіліся станоўча, хоць трапляліся адзінкі, якія хітравалі. З адвячорка праходзіліся яны па вёсцы, а пасля поўначы падаваліся дахаты. Аднавяскоўцы асуджалі такія паводзіны. Казалі, што не пільнуем ад злодзея, толькі ад пажару. У Кузаве, напрыклад, не было пажарнай каманды, бо непадалёк Чаромхі, пры паравозным дэпо, працавала чыгуначная завадская пажарна каманда і каля дзесяці кузаўцаў лічыліся яе членамі. На скрыжаванні дарог, побач сядзібы Яна Смыка і Рэпкі, быў павешаны аўтамабільны вобад, у які білі на трывогу ў час пажару. Але рэдка трапляліся такія выпадкі. Не захавалася мне ў памяці, калі ў вёсцы адмянілі варту. А пакражы трапляліся. І не так даўно, калі турысты з-за мяжы сталі хлынуць у дзевяностых гадах. На адзін дзень рэкамендавалі яны паліва, спіртное і папяросы, затым знаёміліся з гаспадарамі і разглядаліся па панадворку. Праз некалькі дзён бочка з саляркай ды каністрамі знікала. Гаспадар меркаваў, чыіх рук гэта справа, але доказаў не было. Справа выявілася, калі аднаму селяніну ўдалося прыпільнаваць злачынцу. Зачым паліцэйскія прыехалі, па нахабніку след прастыў. Больш аднак у Кузаве не паказаўся.

Зараз усё перамянілася. Мала турыстаў з-за мяжы наведвае вёску ды і пагранічная ахова што і раз наглядае за мясцовасцю. Пастаронніх зразу правяраюць і гэтыя з сапраўднымі дакументамі (і такімі ж візамі) намагаюцца прытрымлівацца закону ў пагранічнай зоне. Ды і ад пажару Усявышні нас пакуль засцерагае. Пажары адышлі ў забыццё. Так, што можам цяпер спаць спакойна.

Уладзімір СІДАРУК

Яшчэ аб двухмоўных указальніках

У „Ніве" № 1 ад 4 студзеня 2009 г. Аляксей Мароз шырока прадставіў наладжаны Звязам беларускай моладзі семінар, на якім былі прадстаўнікі пражываючых у Польшчы нацыянальных меншасцей, якія ганарацца сваёй мовай — немцы, літоўцы. Расказвалі яны пра ўвядзенне на сваёй тэрыторыі двухмоўных і трохмоўных указальнікаў назваў мясцовасцей, рэк і азёр.

У нашай Нарваўскай гміне пражывае больш за 50% насельніцтва праваслаўнага веравызнання, людзей, якія лічаць сябе беларусамі. У гміне ёсць адзін каталіцкі касцёл, 5 цэркваў і дзве капліцы ды царква ў Трасцянцы на могільніку. Войтам Нарваўскай гміны з'яўляецца спадар Якуб Садоўскі родам з Тыневіч-Вялікіх, праваслаўнага веравызнання. Мабыць, войту не хочацца дурыць сабе галаву тэмай указальнікаў, хоць кошт указальнікаў на дзвюх мовах аплачвае Міністэрства ўнутраных спраў і адміністрацыі, толькі трэба трошкі пахадайнічаць. І ў Нараўчанскай гміне таксама каля 50% праваслаўных-беларусаў, і войт сам праваслаўны, але і яму цяжка заняцца справай двухмоўных указальнікаў. Таксама ў Гарадской управе і гміне Гайнаўка больш за 20% праваслаўных жыхароў, якія лічаць сябе беларусамі. У Чыжоўскай гміне больш за 50% беларускага насельніцтва. У паўночна-ўсходняй частцы Бельскай гміны больш за 30% праваслаўных, якія лічаць сябе беларусамі. У паўднёва-ўсходняй частцы Заблудаўскай гміны Беластоцкага павета пражывае каля 40% праваслаўных беларусаў. На цэлай тэрыторыі Міхалоўскай гміны жыве больш за 40% беларусаў. Ва ўсіх успомненых гмінах, апрача Заблудаўскай, войтамі з'яўляюцца беларусы, толькі ім не хочацца займацца беларускай справай! А каб задбаць пра двухмоўныя ўказальнікі, не цурацца сваёй роднай мовы!

Падумайце, даражэнькія: не саромцеся сваёй роднай мовы, якая нам усім дарагая, і ўвядзіце як найхутчэй двухмоўныя ўказальнікі назваў вёсак і рэк. За гэта людзі будуць вам удзячныя!

Мікалай ЛУК'ЯНЮК

Адгаданка

1. сталіца Ірака, 2. птушаня арла, 3. агароджа з вертыкальных прутоў лазы, 4. хімічны элемент н-р 23, 5. крайняя дошка, 6. колькі яго ні кармі, а ён у лес глядзіць, 7. парадак або грамадская сістэма, 8. важная жанчына, 9. не нага, 10. напр. Віталь Шчэрба, 11. не ноч, 12. вадкасць, якую выдзяляюць ныркі, 13. пакуль не грымне, мужык не перахрысціцца, 14. салодкая страва са звараных на вадзе ягад, 15. Крынкі або Міхалова з 1 студзеня 2009 года, 16. чалавекападобная фігура, вылепленая са снегу.

Адгаданыя словы запісаць у вызначаныя дарожкі, пачынаючы ад поля з лічбай. У светлых палях атрымаецца рашэнне — партугальская прыказка.

(ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

	1			2	3						4	
	5						6					
		7					8	9		10		11
					12			13				
14					15		16					

Адказ на адгаданку з 2 нумара

Водар, Гамора, гісторыя, дуга, рай, Сінай.

Рашэнне: **Трымайся новай дарогі і старога друга.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Міхалу Байко** і **Аляксандру Дабчынскаму** з Беластока.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca.
Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.

Prenumerata krajowa
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH" i „KOLPORTER" na terenie całego kraju. Cena prenumeraty kwartalnej — 26 zł., półrocznej — 52 zł., rocznej — 104 zł.

Prenumerata z wysyłką za granicę
Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A. Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734

Prenumerata w redakcji
Planowana ilość numerów „Niwy" w 2009 roku — 52.

Poczta zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,65 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 5,00 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,20 zł.

Poczta lotnicza: Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,00 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 6,70 zł., — Ameryka Południowa — 7,80 zł., — Australia i Oceania — 10,00 zł.
Wpłaty przyjmuje:
Rada Programowa Tygodnika „Niwa",
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Nakład: 1 500 egz.

XVI Агульнапольскі фестываль „Беларуская песня-2009”

Пераможцы цэнтральных элімінацый 8.02.2009 г. у Беластоку

ФАЛЬКЛОРНАЯ АЎТЭНТЫЧНАЯ ПЕСНЯ

Салісты: **I месца:** Кацярына Ціханюк са Збуча; **II месца:** Ніна Аўгустыновіч з Агароднічак; **III месца:** Вера Нічыпарук з Маліннік; **вылучэнне:** Вольга Ахрымюк з Чыжоў, Марыя Міруць-Сіўкоўская з Гарадка.

Дуэты, трыо, квартэты: **I месца:** квартэт „Жэмэрва” (старэйшая група) са Студзівод; **II месца:** квартэт „Васілёчкі” з Бельска-Падляшскага; **III месца:** трыо „Збучанкі” са Збуча, квартэт з Дубін.

Вакальныя ансамблі: **I месца:** калектыў настаўніц з Дзіцячага садка № 14 у Беластоку; **II месца:** калектыў „Арэшкі” з Арэшкава; **III месца:** калектыў „Згодныя макі” з Райска, калектыў „Родына” з Дубяжына; **вылучэнне:** калектыў „Жэмэрва” (малодшая група) са Студзівод.

ФАЛЬКЛОРНАЯ АПРАЦАВАНАЯ ПЕСНЯ

Салісты: **III месца:** Валянціна Арэшук з Орлі, Уладзіслаў Камарчук з Орлі.

Дуэты, трыо, квартэты: **I месца:** сямейнае трыо з Макаўкі, дуэт Люба Гаўрылюк і Уладзімір Іванюк з Беластока; **II месца:** мужчынскі квартэт „Чыжавяне” з Чыжоў; **III месца:** дуэт Галена Датчук і Барбара Лубко з Машчонай-Каралеўскай.

Вакальныя ансамблі: **I месца:** калектыў „Куранты” з Бельска-Падляшскага, жаночая група калектыву „Крыніца” з Беластока; **II месца:** мужчынская група калектыву „Крыніца” з Беластока; **III месца:** калектыў „Чыжавяне” з Чыжоў, калектыў „Каласкі” з Беластока.

Вакальна-інструментальныя калектывы: **I месца:** калектыў „Знічка” з Гайнаўскага белліцэя; **II месца:** жаночая група „Маланка” з Бельска-Падляшскага; **III месца:** капэла „Хутар” з Гарадка; **вылучэнне:** калектыў „Навіна” з Машчонай-Каралеўскай.

Эстрадныя калектывы: **II месца:** гурт „Лайланд” з Беластока; **III месца:** гурт „Тройка” з Гайнаўкі, гурт „Арт-Пронар” з Нарвы.

Хары: **I месца:** хор „Загадка” з Супрасля; **II месца:** хор „Васілёчкі” з Бельска-Падляшскага.

СУЧАСНАЯ ПЕСНЯ

Салісты: **I месца:** Дар’я Маркевіч з Гайнаўскага белліцэя; **II месца:** Марыя Врублеўская з Гарадка, Марк Скамароўскі з Боцек; **вылучэнне:** Рэната Тушынская з Гайнаўскага белліцэя, Таццяна Яхімовіч з Рыбал.

Дуэты, трыо, квартэты: **II месца:** дуэт Ніна Шыманская, Яўгенія Хмялеўская з Орлі; **III месца:** жаночы квартэт калектыву „Чыжавяне” з Чыжоў, квартэт калектыву „Арляне” з Орлі.

Вакальныя калектывы: **I месца:** калектыў „Расспяваны Гарадок” з Гарадка; **II месца:** калектыў „Рэчанька” з Козлік; **III месца:** жаночая група хору „Рэха Пушчы” з Гайнаўкі, мужчынская група хору „Васілёчкі” з Бельска-Падляшскага; **вылучэнне:** калектыў „Асенні ліст” з Гарадка.

Эстрадныя калектывы: **I месца:** „Калінка” з Залук; **II месца:** „Золата” з Бельска-Падляшскага; **III месца:** „Кошыкі” з Беластока; **вылучэнне:** „Імпрэсія” з Бельска-Падляшскага, „Гранд” з Грабянёў.

Вакальна-інструментальныя калектывы: **I месца:** калектыў беларускай песні „Маланка” з Бельска-Падляшскага; **II месца:** калектыў „Дзявочыя ноткі” з Бельскага белліцэя; **вылучэнне:** калектыў „Вясна” з Беластока.

Хары: **II месца:** хор „Крыніца” з Беластока; **III месца:** хор „Рэха Пушчы” з Гайнаўкі. *(фота М. Лукшы)*

„Маланка” з Бельска-Падляшскага

Хор „Крыніца” з Беластока

„Куранты” з Бельска-Падляшскага

„Калінка” з Залук

„Знічка” з Гайнаўскага белліцэя

„Загадка” з Супрасля


Кацярына Ціханюк са Збуча

Люба Гаўрылюк і Уладзімір Іванюк з Беластока

Дар’я Маркевіч з Гайнаўскага белліцэя

15.02 — 21.02

(22.03. — 20.04.) 15-19.02. — пералом у найважнейшых для цябе справах, якія нечакана набяруць агромнага размаху! 17-21.02. — празмерная запальчывасць і гарачка ды заўзятасць у нявартым захаду. Затое парадак у хатніх справах.

(21.04. — 21.05.) 15-19.02. — поспехі ў каханні і бізнесе. Шчасце прадвяшчае поспехі ў кожным плане! Быкі народжаныя на пераломе красавіка і мая знойдуць свой шлях!

(22.05. — 22.06.) Будзеш задаволены, поўны новых ідэй, свабодны, спантанны. У пары будзе найбольш залежаць табе на еднасці душ. Але хоць наўкола шмат цудоўных людзей, не заўсёды зможаш на іх разлічваць.

(23.06. — 23.07.) Да 17.02. дробныя перашкоды будуць цябе моцна нерваваць. Ды хутка збярэш сілы і пераможаш кожную перашкоду. У пары паставіш на лаяльнасць і адказнасць. Той, каго любіш, адазвецца да цябе пасля доўгага перапынку.

(24.07. — 23.08.) Можаш трапіць у камедыю памылак, што моцна можа пакрыжаваць табе планы (усё паправіцца праз тыдзень). Могуць наваліцца на цябе хатнія праблемы, што можа паўплываць на змену планаў. 19-23.02. — сіла волі, харызматычнасць, баявітасць; справішся з кожным выклікам!

(24.08. — 23.09.) Радасць жыцця і пачуццё, што ўсё ідзе ў добрым напрамку. Адкрыешся на змены, будзеш творчы, з запалам возьмешся за новыя мерапрыемствы. Канфлікт таксама можа быць творчы, толькі не зачыняйся на тое, што не змесціцца ў тваёй галаве!

(24.09. — 23.10.) 16-20.02. будзеш карыстацца шалёным поспехам сярод іншага полу. Зачаруеш кожнага! Да 17.02. будзеш вельмі адважны, спрытны, кемліва разбярэшся ў кожнай сітуацыі. Сярод тваіх знаёмых ёсць асоба, якая прабуе сапернічаць з табою; не дазволь, каб цябе бяскарна выкарыстоўвалі!

(24.10. — 22.11.) 14-18.02. — лады з кіраўніцтвам, знакамітыя ідэі, вынікі ў навуцы, бізнесе. З 19.02. рост самаўпэўненасці, рашучасці; ахвота ўзяцца за радыкальныя змены ў жыцці (шмат што ў ім пойдзе ў лепшы бок). 17-21.02. старайся не злавацца; не афармляй у гэты час важных спраў, бо можаш блага сябе павесці.

(23.11. — 22.12.) 15-19.02. — добры час для інтэлектуальнай працы і нялегкага працяглага высілку. Удасца зрабіць табе штосьці неканвенцыянальнае, увядзеш у жыццё далёка ідучыя змены. Закахаеш у сабе каго схочаш! Дасі ход важным справам.

(23.12. — 20.01.) Чым менш будзеш мець сумненняў, тым больш паспяховымі будуць твае дзеянні. Апрача самаўпэўненасці патрэбная табе гнуткасць; інакш зашмат заплаціш за тое, што ўчапіўся за свае перакананні, не заўсёды слушныя.

(21.01. — 19.02.) Будзеш невычэрпнай крыніцай новых ідэй. Няма для цябе бязвыхаднай сітуацыі! Ды 17-21.02. найбліжэйшыя могуць папракнуць цябе ў эгаізме, бескампраміснасці, неахвоце супрацоўнічаць. Не спрачайся, каб шмат не страціць!

(20.02. — 21.03.) Адчуеш сябе як нованароджаны! Пакінуць цябе пакутлівыя сумненні, павесялееш. Квадратура планетоід Юны і Весты 15-19.02. перашкодзіць табе ў канцэнтрацыі, унутранай інтэграцыі. Празмернае засяроджанне на штодзённасці рассее цябе і выпаліць.

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960